Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 САКАВІКА 2012 г. АЎТОРАК № 44 (27159) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Іканапісная майстэрня ў Свята-Елісавецінскім жаночым манастыры была арганізавана яшчэ да пачатку будаўніцтва манастыра.

СТАР. 3



Дом з трысьнягу... Між тым, справа гэта, можна сказаць, звычайная. Ну, не дом, дык частку яго можна пабудаваць з гэтага экалагічна чыстага матэрыялу.

СТАР. 6



Факультэту дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — 35 гадоў.

СТАР. 8

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ УЛАДЗІМІРА ПУЦІНА З ВЫБРАННЕМ ПРЭЗІДЭНТАМ РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ

«Гэта пераканаўчая перамога — яскравае сведчанне высокай ацэнкі народам вашай дзейнасці і імкнення зрабіць Расію яшчэ больш моцнай і паважанай на сусветнай арэне», — гаворыцца ў віншаванні.

«Перакананы, што ваш багаты досвед дзяржаўнай дзейнасці будзе і ў далейшым садзейнічаць пастпальнаму развіццю інтэграцыйных працэсаў на карысць народаў Беларусі і Расіі», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## У БЕЛАРУСІ БУДЗЕ ВЫПРАЦАВАНА ВЫРАЗНАЯ І ДАКЛАДНАЯ СІСТЭМА ПАДТРЫМКІ ШМАТДЗЕТНЫХ СЕМ'ЯЎ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду выпрацаваць выразную і дакладную сістэму падтрымкі шматдзетных сем'яў. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў учора на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод беларускім жанчынам, перадае БЕЛТА.**

«Ураду даручана ў пачатку гэтага года ў сувязі з фінансавымі праблемамі мінулага года выпрацаваць нармальную, выразную і зразумелую сістэму падтрымкі шматдзетных сем'яў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэту дапамогу трэба зрабіць дакладнай, адраснай, і мы гэта зробім у бліжэйшы час. На першым месцы будзе жыллё, каб і ў вёсцы, і ў горадзе шматдзетная сям'я мела дах над галавой».

Прэзідэнт падкрэсліў, што дапамога шматдзетным сем'ям павінна быць прыярытэтам у дзейнасці дзяржавы. «Яна не павінна быць размазанай. Лічу, што шматдзетную сям'ю трэба падтрымаць у галоўным і ў той момант, калі трэба. Гэта момант нараджэння дзіцяці», — сказаў беларускі лідар.

Што датычыцца сферы аховы здароўя, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь цяпер выйшла на самыя высокія рубяжы ў свеце ў пытаннях родадапамогі і дагляду дзяцей. «Калі толькі бацькі не празяваюць, у нас не можа памерці дзіця. Мы выхадзім любое».

Аднак, на думку кіраўніка дзяржавы, аказваючы дзяржаўную падтрымку, неабходна вытрымліваць правільны баланс. «Дапамагаючы, заўсёды трэба шукаць залатую сярэдзіну, каб гэта дапамога не адхіліла саміх бацькоў ад таго, каб працаваць на сваіх дзяцей. Раней жа ніхто нікому не дапамагаў, а ў сем'ях было не менш як 6-7 дзяцей. І тады ўсе бацькі клапаціліся аб сваіх дзецях. Яны іх гадавалі і выхоўвалі працавітых людзей», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што для забеспячэння дэмаграфічнай бяспекі ў краіне прымаецца комплекс мер па ўзмацненні сацыяльна-эканамічнай падтрымкі сем'яў з дзецьмі. Павялічваюцца памеры выплат пры нараджэнні дзіцяці, паляпшаюцца жыллёвыя ўмовы для шматдзетных і маладых сем'яў.

Паводле яго слоў, не выпадкова, што найбольшую групу запрошаных на цырымонію ўручэння дзяржузнагарод склалі шматдзетныя маці, якія ўдастоены ордэнаў за нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей. «Гэта сведчанне асаблівай увагі і павагі да вас з боку дзяржавы. Няма больш важнай і ганаровай для жанчын місіі, чым мацярынства, нараджэнне і выхаванне дзяцей, беражлівыя адносіны да сямейных каштоўнасцяў», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт з задавальненнем адзначыў, што за апошнія 15 гадоў 6 891 жанчына ўзнагароджана ордэнам Маці.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, шчырай удзячнасці заслугоўваюць і жанчыны-працаўніцы, чые поспехі таксама былі адзначаны высокімі ўзнагародамі: «У розных сферах дзейнасці праяўляюць яны свае здольнасці і таленты. Але асабліва значная іх роля ў сістэме дашкольнага выхавання, сярэдняй і вышэйшай адукацыі». «У дзіцячых садах, школах, каледжах і ВНУ вы аддаяце падрастаючаму пакаленню і моладзі часцінку сваёй душы, веды, вопыт, клопат і чуласць. Вы фарміруеце лепшыя чалавечыя і грамадзянскія якасці. Гэта сапраўдная падзвіжніцкая работа і прызванне педагогаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі ёсць усе ўмовы для раскрыцця талентаў людзей творчых прафесій. «Калі ты таленавіты, то цябе заўважаць. І як бы нас ні прыціскалі, з талентамі лічацца», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы павіншаваў усіх жанчын з надыходзячым веснавым святам, пажадаў ім шчасця, дабрабыту, здароўя, любові, новых поспехаў і ўзнагарод. «Асабліва здароўя вашым дзеткам, якія ёсць і, я вельмі спадзяюся, будуць», — дадаў Прэзідэнт.

## «МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ» — 40

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў выдавецкага прадпрыемства «Мастацкая літаратура» з 40-годдзем стварэння выдавецтва.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўстанова адкрылася ў перыяд павышэння цікавасці насельніцтва да літаратуры. За час яе існавання ўбачылі свет творы вядомых беларускіх класікаў: Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Кандрата Крапівы, Івана Шамякіна, Уладзіміра Караткевіча. Нямала ўвагі надавалася і маладым аўтарам.

«Шматлікія ўзнагароды на міжнародных і нацыянальных конкурсах з'яўляюцца сведчаннем высокага творчага і прафесійнага патэнцыялу вашага калектыву», — адзначыў Прэзідэнт.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# «СПОРТ — САМЫ ЛЕПШЫ І ТАННЫ СРОДАК ДЛЯ ЗАХАВАННЯ ЗДАРОЎЯ»



Фота БЕЛТА.

**Такое меркаванне 4 сакавіка на зімовым спартыўным свяце «Мінская лыжня-2012», што прайшло ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы», выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

Каманда Прэзідэнта Беларусі, якая ўдзельнічала ў спаборніцтвах па-за конкурсам, фінішавала першай у лыжнай эстафетнай гонцы 4х2,5 км, у якой змагаліся за перамогу каманды абласцей і горада Мінска (група «А»). Аляксандр Лукашэнка, паказаўшы выдатную спартыўную форму, бег за сваю каманду на заключным чацвёртым этапе эстафеты, прыйшоўшы на фініш значна раней бліжэйшых праследавацеляў.

У конкурсным заліку першае месца заняла каманда Брэсцкага аблвыканкама, на другім месцы — каманда Магілёўскай вобласці, трэцяе месца ў каманды Мінскага аблвыканкама. На заключным этапе за свае каманды выступалі губернатары Канстанцін Сумар, Пётр Руднік і Барыс Батура.

СТАР. 2

## «Мінская лыжня» — свята для ўсёй краіны

Мінск, Жодзіна, Узда, Смалявічы, Барысаў... Геаграфію сёлетняга лыжнага свята можна было ўпэўнена вывучаць па ланцужку аўтобусаў. Балельшчыкаў было шмат. Яны кампактна запаўнялі трыбуны, сцягамі і шыльдачкамі падтрымлівалі сваіх фаварытаў альбо адпачывалі ля падножжа вядомых трамплінаў, дзе арганізавалі адмысловую вулачку з палаткамі і крамкамі. Ахвотныя маглі не толькі сагрэцца гарачай гарбатай, кашай, але паўдзельнічаць у конкурсах. Разам з добрым, сонечным надвор'ем «Мінская лыжня-2012» стала цудоўным дадаткам да выхаднога адпачынку.

Пад'ехалі ў Раўбічы пенсіянеры, вялікія аматары лыжнага спорту Анатоль Скачак і Галіна Змушко. І калі не паўдзельнічаць, дык проста паспрабаваць бялюткую лыжню.

— Ведаеце, я на лыжах хаджу з 1944 года, прайшоў 117 тысяч кіламетраў, — узгадвае 73-гадовы **Анатоль Васільевіч**, член арганізацыі былых малалетніх вязняў канцлагераў. — Бачыце, на маёй шапцы ёсць адпаведны значок. У 1986-м, сярод 12 тысяч удзельнікаў, я прымаў удзел у першым старце «Мінскай лыжні». Тады да Раўбічаў мы ішлі ад Баравой. Нягледзячы на ўзрост, імкнёмся кожны год прымаць удзел ва ўсіх спаборніцтвах, куды запрашаюць. А калі і не, дык ўсё роўна знаходзім шляхі да лыжні.

Тым часам на трасе гучаў голас Уладзіміра Навіцкага, за ўзнагароды па чарзе змагаліся ўдзельніцы леташніх фестываляў «Міс фітнэс Беларусі», каманды аблвыканкамаў і г. Мінска, міністэрстваў і дзяржустаноў. Чацвёрка Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі хоць і выступала па-за конкурснай праграмай, але парадавала гледачоў россыпам славутых айчынных біятланістаў: Алена Зубрылава і Аляксандр Сыман, а таксама Сяргей Булыгін, між іншым, алімпійскі чэмпіён Сараева!

— «Мінская лыжня» — свята для ўсёй краіны, бо ўдзел у ёй прымаюць усе рэгіёны. Гэта цудоўнае мерапрыемства, якое стала добрай штогадовай традыцыяй, — пасля гонкі і цырымоніі ўзнагароджання зазначыла Алена Зубрылава. — Зараз на лыжах я ўжо амаль не стаю, але сёння беглася нядрэнна. Тым больш, за такую каманду.

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Барыс БАТУРА, старшыня Мінскага аблвыканкама.**

***«У рабоце са зваротамі грамадзян важна кіравацца заканадаўствам і не падманваць людзей... Калі патрабаванні неаб'ектыўныя або ў бліжэйшы час не могуць быць ажыццёўлены, заяўнікі таксама павінны гэта ведаць, а не слухаць пустыя абяцанні».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.03.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8240,00 | ▲ |
| Еўра | 10870,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 281,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1026,41 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | 0° |
| Віцебск | – 6° |
| Гомель | – 5° |
| Гродна | – 1° |
| Магілёў | – 6° |
| Мінск | – 3° |

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

# НОВЫХ ПЕРАМОГ ТАБЕ, ДАР'Я!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў члена нацыянальнай каманды Беларусі па біятлоне Дар'ю Домрачаву з заваяваннем першага залатога медаля за ўсю гісторыю ўдзелу суверэннай Беларусі ў чэмпіянатах свету па біятлоне і ўзнагародзіў ордэнам Айчыны III ступені.

«Уся краіна з заміраннем сэрца назірала за гонкай і бялела за зорку беларускага біятлона. Мы ў захапленні і ганарымся табой! Сваім яркім і прыгожым выступленнем ты яшчэ раз пацвердзіла: Дар'я Домрачава — лепшая ў свеце!» — гаворыцца ў віншавальнай тэлеграме.

«Новых перамог табе! Ты сапраўдны лідар нацыянальнай каманды, твар беларускага спорту!» — падкрэсліў Прэзідэнт.

Рашэннем кіраўніка дзяржавы Дар'я Домрачава ўзнагароджана ордэнам Айчыны III ступені.

**БЕЛТА.**

**Другая па ліку жаночая гонка ў нямецкім Рупольдынгу, гонка праследавання, стала для Дар'і Домрачавай «залатой». Для Дар'і гэта таксама першы залаты медаль на сусветным першынстве. Пакуль сярод яе асабістых дасягненняў былі чатыры п'едэсталы на чэмпіянатах: «серабро» ў змешанай эстафеце ў 2008-м, «серабро» ў гонцы з масавым стартам у 2011-м, там жа «бронза» ў эстафеце, а таксама «серабро» тут, у Рупольдынгу ў суботнім спрынце.**

У суботняй гонцы Домрачава на 15 секунд адстала ад немкі Магдалены Нойнер, і для хуткаснай беларускі гэта быў час, які цалкам можна адыграць у гонцы праследавання. Як і чакалася, нядзельная гонка стала спаборніцтвамі дзвюх самых хуткіх біятланістак свету — Нойнер і Домрачавай. І загадзя было зразумела, што шмат чаго тут будзе залежыць ад стральбы. Да заключнага агнявога рубяжа абедзве біятланісткі падышлі не без памылак: Нойнер прамахнулася аднойчы, Домрачава адматала два штрафныя кругі. Перад апошняй стральбой Нойнер мела 30-секундную перавагу над Домрачавай — камфортная фора нават для таго, каб разок прамахнуцца. Але нервы двухразовай алімпійскай чэмпіёнкі здалі. Магдалена памылілася раз, потым яшчэ раз... Немка адпраўлялася намотваць два штрафныя кругі і на стрэльбішчы ўсё залежала ад Дашы. І Домрачава ні адной кулі не адправіла ў «малако»! Калі беларуска адпраўлялася на дыстанцыю, Нойнер яшчэ адпрацоўвала на другім штрафным крузе. Іх раздзяляла 13 секунд, што, улічваючы Дашыны хуткасці, гарантавала нам «золата»!

Але было адно «але»: сістэма зафіксавала толькі адзін промах Нойнер. І нямецкі трэнерскі штаб нейкі час імкнуўся спісаць другі промах: Магдалена трапіла, але мішэнь не закрылася. Такое ўжо здаралася тут на сёлетнім чэмпіянаце падчас змешанай эстафеты, калі мішэнь не закрылася ў нарвежца Б'ёрндалена і ён праехаў лішні штрафны круг.



Фота БЕЛТА.

СТАР. 8

## РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### УНАЧЫ НА 8 САКАВІКА — ДА МІНУС 22

**У аўторак тэрыторыя нашай краіны застанецца на ўскрайку Скандынаўскага антыцыклону, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

Пахаладае. Сёння месцамі пройдзе невялікі снег, на дарогах галаледзіца. Тэмпература паветра ўдзень ад 0 да 7 марозу. Захаваецца халоднае надвор'е 7 і 8 сакавіка.

Уначы на сераду без ападкаў, а ўдзень месцамі невялікі снег. Даволі сонечна і без ападкаў будзе і на свята 8 сакавіка. На дарогах месцамі слізка. Уначы на 7 сакавіка мінус 6—13, па поўначы пры праясненнях да мінус 14—17 градусаў, а ўначы на чацвер па паўночным усходзе маразы ўзмоцняцца ажно да мінус 20—22 градусаў. Удзень 7 і 8 сакавіка будзе 0—7 марозу, аднак па паўднёвым захадзе 1—3 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### МІСІЯ МВФ СКОНЧЫЛА СВАЮ ПРАЦУ Ў БЕЛАРУСІ

**Чарговая місія МВФ у Беларусі скончыла ўчора сваю працу. Яе кіраўнік Крыс Джарвіс засведчыў, што «падчас дзеяння місіі назіралася выдатнае супрацоўніцтва з урадам і Нацыянальным банкам».**

Па выніках місіі, якая пачалася 22 лютага, МВФ даў сваю ацэнку сітуацыі ў Беларусі. Прызнана, што на працягу апошніх месяцаў урад і Нацыянальны банк дасягнулі поспехаў у зніжэнні інфляцыі і скарачэнні знешняга дысбалансу. Крыс Джарвіс падкрэсліў, што ў значнай ступені гэта стала магчыма дзякуючы правядзенню належнай палітыкі. Кіраўнік місіі таксама станоўча ацаніў узважаную эканамічную палітыку на 2012 год: бюджэт збалансаваны, крэдытаванне дзяржаўных праграм жорстка абмежавана, забяспечаны належны кантроль за крэдытамі. «Гэта добрая платформа, на якую можна абапірацца, але наперадзе чакае яшчэ шмат працы», — лічыць Крыс Джарвіс.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

***Падрабязнасці чытайце ў наступным нумары газеты.***

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ТУРЦЫІ КАЛЯ КАНЦЫЛЯРЫІ ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРА ВЫБУХНУЛА БОМБА




У Анкары каля канцылярыі прэм'ер-міністра Турцыі Рэджэпа Эрдагана выбухнула бомба. Як паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на звесткі дзяржаўнага турэцкага тэлебачання, лёгкія раненні атрымаў адзін чалавек. Выбух прылады, змешчанай у невялікую пластыкавую бутэльку, адбыўся за 20 м ад будынка ў цэнтральным раёне Кызылай. Якраз за гадзіну да пачатку пасяджэння кабінета міністраў. 1 сакавіка бомба выбухнула побач з рэгіянальным аддзяленнем кіруючай Партыі справядлівасці і развіцця ў Стамбуле. Тады пацярпелі 15 супрацоўнікаў паліцыі.

### У ЭСТОНІІ НАСТАЎНІКІ ПРАВОДЗЯЦЬ СТРАЙК

У Эстоніі настаўнікі маюць намер з 7 сакавіка 2012 года пачаць трохдзённы страйк. Мяркуецца, што салідарнасць з настаўнікамі праявяць работнікі іншых галін. Як паведаміў кіраўнік саюза работнікаў адукацыі Свен Рондзік, падчас забастоўкі настаўнікаў на вуліцы і плошчы гарадоў выйдуць больш за 15 тыс. чалавек. Асноўнае патрабаванне пратэстуючых — падняць мінімальную стаўку аплаты іх працы на 20%. Акрамя таго, Цэнтральны саюз прафсаюзаў Эстоніі патрабуе ад урада трохбаковага пагаднення для дазволу рознагалосся з касай страхавання ад беспрацоўя.

Патрабаванні настаўнікаў маюць намер падтрымаць таксама медыкі, маракі, працаўнікі грамадскага транспарту і чыгуначнікі. Чакаецца, што свайго піка забастоўкі ў падтрымку патрабаванняў настаўнікаў і Цэнтральнага саюза прафсаюзаў дасягнуць 8 сакавіка.

### ЛІВАНСКАЯ ГАЗЕТА ПАВЕДАМІЛА АБ 13 ФРАНЦУЗСКІХ АФІЦЭРАХ, ЗАХОПЛЕНЫХ У СІРЫІ

Французы былі ўзяты ў палон сірыйскай арміяй, паведаміла газета The Daily Star. Раней аб затрыманні французаў паведамлялася пасля спецаперацыі ў горадзе Хомсе. МЗС Францыі адмаўляе, што ў Сірыі прысутнічаюць французскія войскі, а мінабароны кажа, што пра гэта не ведае.

ISSN 1990 - 763X

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У ПОЛЬШЧЫ АБ'ЯЎЛЕНА ЖАЛОБА ПА ЗАГІНУЛЫХ У ЧЫГУНАЧНАЙ КАТАСТРОФЕ



У Польшчы абвешчана двухдзённая жалоба па загінулых у найбуйнейшай за апошні час чыгуначнай катастрофе, паведамляюць інфармагенцтвы.

У суботу ўвечары на поўдні Польшчы сутыкнуліся лоб у лоб два цягнікі. Паводле апошняй інфармацыі, у выніку трагедыі загінулі 16 і каля 60 пасажыраў атрымалі раненні. У бальніцах рэгіёну зараз застаецца 51 пацярпелы. Многія з іх у цяжкім стане.

Паводле звестак польскай чыгуначнай кампаніі PKP, два пасажырскія цягнікі — Варшава—Кракаў і Пшэмысл—Варшава — сутыкнуліся каля 21.00 па мясцовым часе ў 200 км на поўдзень ад Варшавы. Адзін цягнік ішоў з Варшавы ў Кракаў і, па невядомым пакуль прычынах, апынуўся на іншым шляху, па якім ішоў сустрэчны састаў з Пшэмысл у Варшаву.

Міністр транспарту Славамір Новак заявіў, што гэта самая маштабная чыгуначная катастрофа за апошнія гады ў Польшчы. Трагедыю расследуе камісія па чыгуначных здарэннях, а таксама пракуратура. Версіі аб прычынах здарэння пакуль не называюцца.

## КОРАТКА

Па выніках таргоў на адзінай сесіі Беларускай валютна-фондавай біржы 5 сакавіка беларускі рубель зафіксаваў пазіцыю Br8 240/1$ (на папярэдніх таргах 2 сакавіка — Br8 230/$1). На таргах расійскім рублём устанавіліся суадносіны Br281,5 за 1 расійскі рубель (2 сакавіка — Br281 за 1 расійскі рубель). Адносна еўра беларускі рубель спыніўся на пазіцыі Br10 870 за 1 еўра (2 сакавіка — Br10 930 за 1 еўра).

4 сакавіка, у дзень памяці апекуна рамеснікаў святога Казіміра, у Гродне прайшоў ужо традыцыйны кірмаш «Казюкі». На свята ў горад над Нёманам з'ехалася больш за сто народных умельцаў з розных рэгіёнаў Гродзеншчыны і іншых абласцей Беларусі, а таксама госці з Літвы, Польшчы і Украіны.

Загадам міністра лясной гаспадаркі ўведзена ў дзеянне сістэма правядзення аператыўных кантрольных мерапрыемстваў (рэйдаў) па ахове рэсурсаў паляўнічых жывёл на тэрыторыі ляснога фонду.

## ЯК ВЫ ЗМАГАЕЦЕСЯ З ВЕСНАВОЙ ДЭПРЭСІЯЙ І АВІТАМІНОЗАМ?



**Алена Котава, дырэктар Магілёўскага філіяла РУП «Белпошта»:**

— Самым натуральным чынам: апранаюся ў яркае, гляджу на ўсё яркае і кантактую з яркімі людзьмі. Гэты самы лепшы спосаб захаваць аптымізм, які пераможа і дэпрэсію, і авітаміноз. Таму што гэты стан — у галаве, а не ў целе. Аптымізм не залежыць ні ад грошай, ні ад чаго іншага: можна мець тры капейкі ў кішэні і быць самым шчаслівым чалавекам, захоўваць пазітыўны настрой. Я чакаю ад гэтай вясны кахання, спадзяюся на самае лепшае і веру, што ўсе мае надзеі абавязкова спраўдзяцца.



**Галіна Конанава, магілёўская мастачка, навуковы супрацоўнік Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П. Масленікава:**

— Калі мастаку няма чаго сказаць, тады ў яго будзе шмат дэпрэсій і тупікоў. Калі ёсць што сказаць, то невялікі веснавы авітаміноз можна паправіць, калі назіраць за прыродай. Таму што ўвесь свет — гэта цуд. І трэба не сядзець дома каля тэлевізара, а выйсці на вуліцу: сонца чароўнае, дзівосныя дрэвы, усё прыгожае, а хутка прыйдуць цеплыня і цвіценне. Каму пакуль не хапае веснавых колераў, прыходзьце на выставу «Сола на дваіх», якую гэтымі днямі адкрылі я і мой муж, мастак Уладзімір Конанаў, у выставачнай зале ў Магілёве. Ён выказвае свае пачуцці філасофскай графікай і скульптурай, а я сваімі фарбамі хачу падарыць радасць людзям. Усміхайцеся!



**Уладзімір Панцюхоў, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— Пішу вершы! Не верыце? «Знайдзіце час для сябе, бо жыццё скарачэннае...», «Не бойцеся сказаць «кахаю»... Разумееце, самае галоўнае ў жыцці — гэта ведаць, што цябе кахаюць, але калі кахаеш і ты — жыццё набывае зусім іншы сэнс.

Ну і ўстаноўка, якую ты даеш самому сабе, значыць вельмі шмат. Я сабе прыдумаў дэвіз: «Не ведаю, што будзе потым і далей, але зраблю ўсё, каб гэта было». Вось так жыву і працую. І перад гэтым адступаюць усе дэпрэсіі і авітамінозы.

**Падрыхтавала Ілона ІВАНОВА.**
**Фота Ірыны САВОСІНАЙ.**

# «СПОРТ — САМЫ ЛЕПШЫ І ТАННЫ СРОДАК ДЛЯ ЗАХАВАННЯ ЗДАРОЎЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Узнагароды пераможцам гонак уручыў асабіста Аляксандр Лукашэнка.

Для гледачоў і ўдзельнікаў свята была арганізавана шырокая спартыўна-забаўляльная праграма. Арганізатары падрыхтавалі мноства конкурсаў і спаборніцтваў, у тым ліку на сілу, спрыт і кемлівасць.

Гутарачы з прадстаўнікамі беларускіх і замежных СМІ, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў яго самыя добрыя ўражанні ад мерапрыемства. Пры гэтым ён падкрэсліў, што «Мінская лыжня» фактычна стала агульнарэспубліканскай, таму што ў ёй прымалі ўдзел каманды з рэгіёнаў Беларусі. «Малайцы Барыс Батура, Канстанцін Сумар, якія беглі ў лідарах. Гэта сведчыць аб тым, што ўзрост спорту не перашкода», — заўважыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы таксама асабліва адзначыў, што падобныя масавыя спартыўныя спаборніцтвы праводзяцца не для піяру, а каб прыцягнуць да спорту, а значыць, і да здаровага ладу жыцця як мага больш людзей. «Мы заўсёды кажам, што самае дарагое — гэта здароўе. Але таму, што здароўе даецца чалавеку бясплатна, не кожны дбае пра яго. А дарэмна, таму што нават бясплатныя лякарствы ніколі не дапамогуць чалавеку выздаравець. А вось на лыжах ад хвароб ўцячы можна. Спорт — самы танны сродак, каб захаваць здароўе».

Адказваючы на пытанне аб медальных перспектывах беларускіх спартсменаў на маючай адбыцца летняй Алімпіядзе ў Лондане, Прэзідэнт сказаў: «Я быў бы дрэнным Прэзідэнтам Нацыянальнага алімпійскага камітэта, калі б не спадзяваўся на поспех нашых спартсменаў».

Паводле яго слоў, Беларусь на душу насельніцтва ў ходзе розных міжнародных спартыўных спаборніцтваў заваёўвае больш узнагарод, чым якая-небудзь іншая краіна. «Хацелася б, каб у нас усе былі далучаны да спорту і каб на спартыўных спаборніцтвах быў большы вынік. Хіба добра, калі ў першым раўндзе плей-оф мінскае «Дынама», якое фінансуецца так, што дай бог кожнаму віду спорту, прайгравала, можна сказаць, ганебна, без усялякай барацьбы. Гэта нядобра. Таму ёсць над чым задумацца адпаведным начальнікам ад спорту». «Мы разлічваем, што на летніх Алімпійскіх гульнях у Лондане намечаны намі рубеж — 25 медалёў — мы можам дасягнуць, — сказаў Прэзідэнт. — Гэта будзе вялікая нечаканасць, калі мы не возьмем свае медалі на гэтых спаборніцтвах».

Па просьбе журналістаў кіраўнік дзяржавы пракаментаваў інфармацыю аб магчымым пераглядзе месца правядзення чэмпіянату свету 2014 года па хакеі з шайбай, які плануецца правесці ў Мінску. «Тыя, хто сёння прапануе не праводзіць чэмпіянат свету ў Беларусі (ёсць асобныя дзялкі), да спорту ніякага дачынення не маюць. Тыя палітыкі, якія, можа быць, нават не палітыкі, а людзі каля палітыкі, напэўна, і клюшкі з шайбай не бачылі, а можа, і блытаюць іх, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Таму я на гэта рэагую спакойна. Але тым не менш тэст для Міжнароднай федэрацыі хакея — у наяўнасці. Паглядзім, як спорт і палітыка не звязаны адзін з адным».

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў той ажыятаж, які, паводле яго слоў, узняла «пятая калона», гаворачы аб іміджавых стратах для Прэзідэнта і краіны ў цэлым у выпадку пазбаўлення Беларусі права правядзення чэмпіянату. «Як вы думаеце, калі чэмпіянат свету ў Беларусі не адбудзецца, мы што, заўтра спруцянеем? Ды не, мы будзем жыць. Тое, што мы пабудавалі (гасцініцы, спартыўныя пляцоўкі) і да чэмпіянату свету і без яго, — гэта ўсё застанецца нашаму народу. І чэмпіянат свету быў намечаны тут таму, што мы шмат пабудавалі для развіцця лядовых відаў спорту».

«Таму, я думаю, перажываць нам рана за тое, што ў нас адбудзецца ці не адбудзецца чэмпіянат свету. Рашэнне прынята. Чэмпіянат свету павінен быць тут. Калі гэта рашэнне будзе адменена, паверце, лішні раз асобныя людзі пакажуць, чаго яны каштуюць, — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. — Я менш за ўсё напружваюся наконт таго, што пайшлі нейкія размовы аб пераносе чэмпіянату свету. Гэта непрыемны факт з боку асобных чыноўнікаў нашай планеты, перш за ўсё, амерыканцаў і асобных еўрапейцаў». «Беларусы заслужылі правядзенне ў сябе чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе. І мы да яго будзем рыхтавацца вельмі сур'ёзна».

Прэзідэнт выказаўся і наконт нядаўняга абвастрэння ў адносінах з Еўрасаюзам пасля чарговага пашырэння візавых санкцый у дачыненні да беларускіх грамадзян і адклікання паслоў краін ЕС для правядзення кансультацый.

«Гэта абсалютная істэрыка, і, як вы бачыце, у авангардзе два тыпы палітыкаў ці ўвогуле два тыпы ад палітыкі. Адзін міністр жыве ў Варшаве, другі — у Берліне», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Ну, калі аднаму нашаму суседу не сядзіцца — зразумела. Я ж кажу, карты ўжо прамаляваны да Мінска — тэрыторыя Польшчы там ужо. Зразумела, трэба неяк гэтыя малюнкі падтрымліваць, падмацоўваць, апраўдваць. Таму і ідуць такія заявы. Я толькі не ведаю, якое дачыненне гэтыя палітыкі маюць да польскага народа або польскі народ да гэтых палітыкаў. Гэта наогул чужыя людзі для Польшчы. Ясна, чыю палітыку яны сёння праводзяць. Гэтыя людзі — не палякі. Яны чужыя польскаму народу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Што датычыцца другога, не то ружовага, не то блакітнага, які там пра дыктатуру крычаў... Пачуўшы гэта, я падумаў: лепш быць дыктатарам, чым блакітным. Але бог з ім. Пытанне ў іншым, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы ўсе памятаем сярэдзіну мінулага стагоддзя і што свет атрымаў ад іх дыктатуры. Наш народ яшчэ не апамятаўся да гэтага часу. Таму не ім нас папракаць наконт нейкай дыктатуры. Я на гэту тэму ўвогуле разважаць не хачу».

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы падзяліўся некаторымі сваімі назіраннямі: «Мяне ў свой час (каля 15 гадоў таму) здзівіла, наколькі кіраўнікі Германіі далікатна ставяцца да людзей, якія пацярпелі ў гады Другой сусветнай вайны. Усе кланяюцца, на калені становяцца, кветкі загінулым нясуць. Наша краіна страціла трэць свайго насельніцтва. Дык вы з намі яшчэ за гэта не разлічыліся. Што вы нас нахіляеце пастаянна?»

«І я сёння зразумеў, што ўсё гэта было гульнёй з боку палітыкаў Германіі. Калі б гэта была не гульня, яны шанавалі б нас за тое, што мы не толькі свет выратавалі ад карычневай чумы, але і насельніцтва Германіі. Гэта мяне найбольш турбуе: як жа так хутка можна было забыць усё гэта?» — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца санкцый, Прэзідэнт адзначыў: «Усе гавораць аб тым, што суд павінен быць незалежным. Яны пачалі націск на суддзяў, і гэта не выпадкова. Гэта сігнал суддзям: глядзіце, будзеце не так судзіць, як хочуць у Брусэлі ці Вашынгтоне, значыць, мы вам візу не дадзім, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Але суддзя залежыць толькі ад аднаго — артыкула закона. Ён не мае права інакш. За што ж судзіць суддзю?..»

«Або трапілі там (у чорны спіс ЕС) два міліцыянеры. Гэта таксама сігнал: глядзіце, будзеце змагацца за стабільнасць Беларусі, будзеце гэтую «пятую калону» ў прытомнасць прыводзіць, мы вам таксама візу не дадзім. Гэта ўсё сігналы ў адным напрамку. Ім карціць парушыць нашу стабільнасць і знішчыць нашу дзяржаву, зрабіць яе падручным ва ўсіх адносінах», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. «Мы ім гэта дазволіць не можам. Таму мы будзем (я іх папярэдзіў загадзя) вельмі жорстка рэагаваць на іх так званыя санкцыйныя меры. Што мы, дарэчы, і робім. Так бы зрабіла любая іншая дзяржава. Мы нікому жыць не перашкаджаем і перашкаджаць не будзем, але прымусім сябе паважаць».

Яшчэ адно пытанне ад прадстаўнікоў СМІ датычылася беларуска-расійскіх адносін і таго ўплыву, якое на іх могуць аказаць вынікі прэзідэнцкіх выбараў у Расіі. «Хто б ні перамог у Расіі на прэзідэнцкіх выбарах, нашы адносіны будуць дынамічна развівацца. І як бы камусьці ні хацелася, каб гэтыя адносіны пагоршыліся, яны не пагоршацца пры любым зыходзе прэзідэнцкіх выбараў. Мы з любым чалавекам знойдзем добрыя адносіны. Я ў гэтым перакананы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Расія для Беларусі — краіна не чужая: «Гэта наша Расія, я заўсёды гэта падкрэсліваю. Мы жылі разам з Расіяй у адной дзяржаве, былі цэментуючым звяном гэтай дзяржавы. І наогул рускія ад беларусаў нічым не адрозніваюцца. Гэтым усё сказана. Гэта ляжыць у аснове нашых адносін».

Акрамя таго, Прэзідэнт Беларусі нагадаў, што выбары ўжо можна сказаць прайшлі, а таму важна, што будзе пасля іх. «Хачу вельмі спадзявацца, што расіяне, як мне здаецца, разабраліся ў сітуацыі і будуць думаць аб тым, каб будаваць спакойную, стабільную, магутную, моцную Расію. Таму што Расія не толькі для расіян. Яна вельмі важная як адна з апор усёй нашай планеты. Таму трэба адказна ставіцца да таго, якая будзе Расія», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

# МІНСКАЯ ЛЫЖНЯ — СВЯТА ДЛЯ ЎСЁЙ КРАІНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Удзельніцам фестывалю «Міс фітнэс Беларусі», якія індывідуальнай гонкай адкрывалі лыжню, спраўляцца з непаслухмянымі лыжамі было няпроста, аднак да фінішу пад звычнае гукавое афармленне Уладзіміра Навіцкага яны дайшлі, а прызёрак узнагародзіў сам Аляксандр Лукашэнка.

— Я вельмі рада, што трапіла на п'едэстал, — трымаючы букет кветак, кажа **Ганна Саўкіна** — уладальніца другой узнагароды. — Ужо нават паспела патэлефанаваць і распавесці пра поспех сваім бацькам. Для іх гэта стала нечаканасцю. На лыжах у апошні раз каталася чатыры гады таму, калі яшчы студэнткай была. Але стому адчувала толькі напрыканцы.

Дарэчы, самым хуткім губернатарам аказаўся Канстанцін Сумар. Менавіта Брэсцкая вобласць у конкурсным заліку заняла першае месца, апярэдзіўшы каманды Магілёўскай і Мінскай абласцей.

Пасля гонкі Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ў яго склаліся добрыя ўражанні ад мерапрыемства. Адзначыў Прэзідэнт і актыўнасць кіраўнікоў абласцей: «Малайцы Барыс Батура і Канстанцін Сумар, якія беглі ў лідарах. Гэта гаворыць пра тое, што ўзрост спорту не перашкода».

Падтрымаць усіх удзельнікаў у Раўбічы прыехаў **трэнер хакейнага клуба «Юнацтва» Міхаіл Захараў**. Аказалася, Міхаіл Міхайлавіч таксама захапляецца лыжамі:

— Прыкладна двойчы на тыдзень стараюся выходзіць на лыжню ў Драздах, — кажа хакейны спецыяліст. — Хлопцы ў маёй камандзе дрэнна катаюцца. Я лепш за ўсіх. А сёння я прыехаў «пахварэць» за ўсіх, хто ўдзельнічае. Губернатары малайцы. А ў якой добрай форме Прэзідэнт знаходзіцца! Гэта заўважна. Калі чалавек фізічна добра сябе адчувае, у яго ўсё атрымліваецца. Гэта паказчык нумар адзін. Ды і наогул, чым больш мы спортам займаемся, тым лепш. Адназначна.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

*Мінскі раён.*

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ ПРЭЗІДЭНТУ ПОЛЬШЧЫ Ў СУВЯЗІ З ГІБЕЛЛЮ ЛЮДЗЕЙ У ЧЫГУНАЧНАЙ АВАРЫІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Польшчы Браніславу Камароўскаму, родным і блізкім загінулых і пацярпелых у выніку чыгуначнай аварыі пад Шчэкацінамі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# ПУЦІН І ІНТЭГРАЦЫЯ — СЛОВЫ СІНАНІМІЧНЫЯ

**Уладзіміру Пуціну хапіла і першага тура для перамогі над супернікамі ў прэзідэнцкай гонцы. Вынікі расійскіх выбараў могуць выклікаць якую заўгодна рэакцыю, толькі не здзіўленне. Не трэба быць празорлівым палітолагам і ўжо тым больш экстрасэнсам, каб прадказаць такі зыход. Прыкметна, што «самаму высокаму» кандыдату дасталася «бронза» ў гэтым спаборніцтве. А ў сталіцы дык і наогул «серабро». Першая ў расійскай гісторыі спроба бізнэсмена стаць прэзідэнтам хоць і не ўдалася, але да пэўных высноў абавязвае. У алігарха Міхаіла Прохарава ёсць досыць салідная электаральная база. І хоць сёння яна яшчэ недастатковая для поспеху, гэта добры зачын, магчыма, ужо для наступных выбараў. А час у гэтага палітыка ёсць — ён жа не толькі самы высокі, але яшчэ і самы малады кандыдат.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Балотны» бунт у ноч пасля выбараў не паўтарыўся. Магчыма, таму, што найбуйнейшыя пляцоўкі былі занятыя мітынгамі ў падтрымку пераможцы. Лідар электаральнай гонкі Уладзімір Пуцін сам рабіў акцэнт на тым, што выбары павінны прайсці транспарэнтна. Менавіта ён ініцыяваў фарміраванне корпуса назіральнікаў і абсталяванне выбарчых участкаў вэб-камерамі.

Назіральная місія СНД сур'ёзных парушэнняў не выявіла, а дапушчаныя дробныя тэхнічныя хібы, мяркуе, на волевыяўленне грамадзян не паўплывалі. «Нашы назіральнікі прысутнічалі пры адкрыцці ўчасткаў, самім працэсе галасавання, закрыцці і пачатку падліку галасоў. У нас практычна адзінадушнае меркаванне, што на ўчастках была добразычлівая атмасфера. Члены камісіі ўважліва ставіліся да назіральнікаў і выбаршчыкаў», — распавёў журналістам **Вадзім ПАПОЎ, кіраўнік групы назіральнікаў ад Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах**.

Сваімі ўражаннямі ад назірання за расійскімі выбарамі падзяліўся з чытачамі «Звязды» **Сяргей КРЫЖЭВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрных пытаннях**:

— Парушэнняў, якія маглі б паставіць пад сумненне вынікі выбараў, не зафіксавана. І паводле маіх уражанняў, іх і не было. А гэтыя заявы пра фальсіфікацыі, на мой погляд, суб'ектыўныя і надуманыя. Як назіральнік я працаваў на 10 участках: на першым — пры адкрыцці, на апошнім — пры закрыцці. На ўсіх адчувалася добрая падрыхтоўка членаў выбарчых камісій, высокі арганізацыйны ўзровень. Асабліва хочацца адзначыць актыўнасць выбаршчыкаў. Я прысутнічаў і на выбарах у Думу некалькі месяцаў таму. Тады таксама была неблагая актыўнасць, але тут проста аншлаг. Адчуваецца, людзі з жаданнем ішлі. Перакананыя, што абраны імі прэзідэнт вызначыць будучыню не толькі краіны, але і кожнага выбаршчыка. Пытанне пра ўплыў вынікаў выбараў на стасункі з Беларуссю ў нашай сітуацыі, мне падаецца, рытарычнае. Трэба разумець, што абраны прэзідэнт не проста асобнай краіны, а дзяржавы, якая з'яўляецца суб'ектам саюзных узаемаадносін. У нас ёсць органы Саюзнай дзяржавы, Мытны саюз, Адзіная эканамічная прастора. Уладзімір Пуцін заўжды быў удзельнікам інтэграцыі і ніколі не адыходзіў далёка ад гэтага. Апошнім часам інтэграцыйныя працэсы прыкметна актывізаваліся. Таму я з надзеяй гляджу ў будучыню і веру, што збліжэнне двух братэрскіх народаў будзе працягвацца.

Прагаласаваць расійскія грамадзяне маглі і ў Беларусі. Каля расійскага пасольства ў сталіцы выстраіўся цэлы натоўп ахвотнікаў. Толькі тут прагаласавала больш за 5 тыс. чалавек. Наогул у нашай краіне каля 13 тыс. расійскіх грамадзян узялі ўдзел у выбарах. Цікава, што па выніках галасавання расіян у Беларусі Прохараў і Зюганаў памяняліся месцамі ў рэйтынгу электаральных пераваг. Насупраць іх прозвішчаў пакінулі адзнаку каля 15 адсоткаў і амаль 12 адсоткаў выбаршчыкаў адпаведна. Лідарскія пазіцыі засталіся за Уладзімірам Пуціным: яму аддалі свае галасы амаль 67 адсоткаў расіян, якія прыйшлі на выбарчыя ўчасткі ў Беларусі.

Як паўплываюць выбары на кантакты дзвюх краін, разважае **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД Віталь БУСЬКО**:

— Пуцін і інтэграцыя — гэтыя два словы сёння сінанімічныя. У інтэграцыйных працэсах Беларусь зможа знайсці сябе і ўласнае самавыражэнне. Таму гэта якраз той выбар, які сёння падыходзіць як расіянам, так і беларусам. Мы ж, са свайго боку, спадзяёмся на стабільнасць, большую адкрытасць палітыкі Расіі ў дачыненні да Беларусі і далейшае ўмацаванне інтэграцыйных працэсаў. Краіна, якая мае такога моцнага суседа-саюзніка, па-іншаму ўспрымаецца і ў свеце.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## АБЗАЦ

◢ У сувязі з пераносам працоўнага дня ў сакавіку ў Беларусі зменены графік работы ўстаноў аховы здароўя. Амбулаторна-паліклінічныя арганізацыі 8 сакавіка будуць працаваць па графіку святочнага дня, 9 і 10 сакавіка — суботняга дня, 11 сакавіка — працоўнага дня.

◢ **У Гродне на працягу выхадных дзён двое дзяцей праваліліся пад лёд на рацэ Нёман. У суботу хлопчыка, вучня 6 класа, выратаваць не ўдалося. На наступны дзень шасцікласніцу выратаваў мужчына, які падплыў да яе на лодцы і даставіў на бераг. Дзяўчынка з пераахаладжэннем трапіла ў бальніцу.**

◢ У Клічаўскім раёне дзве школьніцы скончылі жыццё самагубствам. Стрыечных сясцёр, навучэнак 9 і 10 класа, знайшлі павешанымі ў кватэры адной са знаёмых іх бацькоў. Знаёмая расказала, што дзяўчаты напярэдадні папрасілі ключы ад кватэры, каб там пераначаваць пасля дыскатэкі. Бацькі пра гэта не ведалі і, калі сёстры не вярнуліся раніцай дадому, пачалі непакоіцца ды звярнуліся ў Клічаўскі РАУС. Па факце праводзіцца праверка.

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ **Самарскія прыставы знайшлі нарэшце мужчыну, які быў аб'яўлены ў федэральны вышук у сувязі з тым, што на працягу некалькіх гадоў ухіляўся ад выплаты аліментаў на ўтрыманне дзіцяці. Якое ж было ўсеагульнае здзіўленне, калі высветлілася, што ён... змяніў пол. Менавіта таму яго і не маглі так доўга знайсці — шукалі мужчыну, а ён стаў жанчынай. Між тым, нягледзячы на змену полу, даўгі па аліментах хітруну ўсё ж давядзецца плаціць.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# «НАПІШЫ ТАК, КАБ «ЗВЯЗДА» НАДРУКАВАЛА»

95 ЗВЯЗДА

**...Мінулым летам на аўтамабілі я падарожнічаў па поўначы Беларусі. З Полацка вырашыў наведацца ва Ушачы. Прычым паехаць па старой, пракладзенай шмат стагоддзяў таму дарозе. Так, цяпер яна заасфальтавана. Аднак прыкметы даўніны відаць вельмі добра. Гэтую дарогу не будавалі, яе пракладвалі. Пракладвалі «паміж пустак, балот беларускай зямлі». А таксама — сярод азёраў. Таму і ўецца яна, абыходзячы злева і справа гэтыя азёры, балотцы, нізіны-пустэчы. Даўным-даўно не было тых магчымасцяў, тэхнікі — трактароў, бульдозераў, экскаватараў, скрэпераў — каб выраўнаваць дарогу, пракласці яе напрасткі, пабудаваўшы насыпы і масты. Дарэчы, з дарогі азёраў амаль не відаць: бярозы, сосны ды елкі абкружаюць берагі гэтых азёраў. Адразу каля яе пачынаецца густы лес.**



На каменны брук, а дзе і на жвір палатна дарогі асфальт паклалі ў канцы пяцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя. Думаю, не абышлося без удзелу ў гэтай справе і аднаго з тагачасных кіраўнікоў рэспублікі — Уладзіміра Лабанка, Героя Савецкага Саюза. Ён у вайну камандаваў тут партызанскімі злучэннямі, якія абаранялі вялізную тэрыторыю, свабодную ад акупантаў. Дарога з Мінска на Полацк у тыя гады станавілася стратэгічнай у эканамічным сэнсе. Будаваўся Наваполацкі нафтахімічны комплекс, ды і сам малады горад. Грузы пераважна ішлі чыгункай. Аднак і па аўтадарозе грузавы паток павялічыўся ў разы. Так што старую шашу з Мінска на Полацк добра паднавілі. А з Лепеля ў той бок неўзабаве нават праклалі новую аўтамагістраль. Па ёй цяпер усе і едуць.

Аднак я наўмысна вырашыў накіравацца з Полацка менавіта па старой дарозе. Лічы, што паўвека не ехаў па ёй — з пачатку шасцідзясятых гадоў. Тады мяне пасля дзесяцігодкі ўзялі літаратурным супрацоўнікам у Лепельскую раённую газету. А раён наш у той час быў вельмі вялікі — уключаў у сябе ўсю тэрыторыю цяперашняга Ушацкага раёна. Скажам так — ад ракі Бярэзіны да Заходняй Дзвіны.

— Каля Ушачаў будуецца тэлерэтранслятар! — сказаў рэдактар Іван Алексін. — Паедзь і напішы рэпартаж.

Даехаць было проста. З Мінска ў Полацк і Наваполацк, праз Лепель і Ушачы ішло шмат грузавікоў.

А будоўля была ў самым разгары. У вышыню цягнуліся металічныя канструкцыі. Шмат іх, гатовых да мантажу, ляжала побач. Як жа няпроста было прывезці іх сюды ад чыгуначнай станцыі па такой звілістай лясной дарозе! З кузава вялізнага МАЗа аўтакранам здымалі вялізныя бухты з кабелем. Па полі расцягвалі тоўстыя трасы — яны ў якасці расцяжак будуць падтрымліваць строга вертыкальную вежу. Немаленькі будынак для электроннага абсталявання, што ўзводзіўся побач, здаваўся карлікам у параўнанні з вежай.

— А наверх можна? — запытаўся ў аднаго з майстроў.

— Няможна,— весела адказаў той. — Але калі табе так хочацца — каску на галаву і лезь, пакуль страшна не стане.

Высока я не палез. І не толькі таму, што пабаяўся. Нават з невялікай вышыні адкрылася панарама будоўлі, а далей — азёры, азёры, азёры. І лес па берагах. Ушацкія вёскі і вёсачкі. Думалася, што ўбачу і Полацк, аднак ён хаваўся недзе за гарызонтам.

— А вось тэлесігнал лёгка дасягне і Полацка, і Наваполацка, і Новалукомля, і нават куды больш далёкіх гарадоў і вёсачак, — тлумачылі мне маладыя радыёінжынеры. — Радыус устойлівага прыёму будзе добрых сто кіламетраў. Так што глянеш па карце...

Было зразумела, што ўсе тут адчуваюць важнасць сваёй справы, яе неабходнасць людзям. Прычым большасць з іх жывуць «у радыусе» прыёму телесігналу. І, відаць, дома ў іх пытаюцца: «Калі ж вы пабудуеце телерэтранстлятар?».

Нам, спешчаным цяпер дасягненнямі ў галіне тэлекамунікацый, цяжка зразумець, наколькі важнай была будоўля каля Ушачаў. Тэлевізійныя перадачы ў гэтым вялізным, густанаселеным рэгіёне нельга было прымаць. Толькі нямногія аматары, спрабуючы сябе ў канструяванні груваcткіх антэн, дабіваліся няўстойлівага, са «снегам» на экране, тэлевізійнага прыёму.

Тыя, хто будаваў тут, пад Ушачамі, тэлерэтранслятар, былі рады, што да іх прыехаў карэспандэнт. Шкадавалі , што з невялікай, усяго толькі з раённай газеты. Давалі мне такія пажаданні-парады:

— А ты пастарайся, напішы так, каб цябе мінскія газеты надрукавалі. «Звязда», напрыклад.

Не ведаю, ці патрапіла такая парада Богу ў вушы, а вось мне — патрапіла. Як жа я стараўся, працуючы над гэтым рэпартажам! Пісаў, каб змясціць у ім і тэхнічныя даныя, і «лірыку» будоўлі, і назваць прозвішчы будаўнікоў і мантажнікаў...

У гэтыя дні спецыялізаваныя магазіны па продажы насення, бадай, самыя папулярныя ў Мінску. Гандлёвы пункт па вуліцы Якуба Коласа не выключэнне. Каля вітрын з featured розанакаляровымі пакецікамі тоўпіцца чалавек 20. Праўда, моладзі не відаць. У асноўным — пажылыя жанчыны. Выбар тут сапраўды шырокі. Напрыклад, удалося налічыць больш за 30 найменняў гатункаў таматаў, салодкіх перцаў, баклажанаў. Фасоўка маленькая — 0,2, 0,3, 0,5 грама, затое цэны — ад 1800 да 4000 рублёў. А некаторыя гатункі прадаюцца наогул паштучна. Прынамсі, 10 зярнятак таматаў «Верліёка» каштуе 4900 рублёў. Нарасхват ідзе цыбуля-сявок: расійская — 25600 рублёў за кілаграм, галандская — 30000 рублёў.

Дачнікі — людзі гаваркія, шчырыя, гатовы любому даць параду. Адна з жанчын, можна сказаць, прачытала мне цэлую лекцыю:

— Правільна выбранае насенне — гэта больш чым 50% будучага ўраджаю. Таму да справы трэба падыходзіць адказна, без спеху, вызначыцца, куды будзеце высяваць насенне. Для адкрытага грунту выбірайце больш раннія гатункі. У Беларусі кароткі вегетацыйны перыяд, і ўраджай можа не выспець. Смела бярыце памідоры «Загадка», «Пажар». З невялікай градкі ў мінулым годзе я сабрала каля 20 кілаграмаў.

Па словах іншай пакупніцы, яна аддае перавагу замежным гатункам. «Калі для іх стварыць належныя ўмовы, то можна атрымаць добры ўраджай». Айчынная прадукцыя пасля паспявання, на яе думку, не заўсёды адпавядае таму прыгожаму малюнку, што змешчаны на ўпакоўцы.

Мне здавалася, што ў параўнанні з мінулым годам пакупнікоў у фірменных і спецыялізаваных крамах павінна быць менш, паколькі цэны скаканулі ўдвая. Але прадаўцы сцвярджаюць,што наведвальнікаў шмат, купляюць шмат. Дэфіцыту насення, сапраўды, няма, абы толькі грошы.

— Перац «Тройка», 20 зярнятак — 2,5 тысячы рублёў, — не можа стрымаць эмоцый пакупніца. — Але ж чатыры соткі толькі ім не запоўніш, патрэбна яшчэ з дзясятак найменняў культур. «Заланы» ўраджай атрымліваецца з улікам падкормкі, угнаенняў, хімікатаў, транспартных выдаткаў.

Сяльчанка Ганна Іванаўна сёлета засталася без гаспадара, але плануе засеяць усё поле, як і папярэднія гады. «Відаць, у нас, людзей старэйшага пакалення, менталітэт такі. Сорам, каб зямліца зарастала дзірваном ды пустазеллем». Звычайна яна набывае насенне ладнымі партыямі.Таму для жанчыны найбольш падыходзіць фірменны магазін Інстытута агародніцтва, што на вуліцы Маякоўскага, дзе можна купіць насенне на вагу.

У гандлёвым зале прыкметна выдзяляецца даволі рухавая пажылая пара. Завітала сюды, як аказалася, каб прыдбаць зярняты кавуноў беларускай вытворчасці: «Летась у маі высадзілі гатунак «Цукровы малы», а ўжо на пачатку жніўня атрымалі першы кавун. Цяпер вырашылі паэксперыментаваць з іншымі гатункамі, а заадно набыць перцы «Алеся». Па іх словах, летась яны далі нядрэнны ўраджай. Прынамсі, добра пераносяць перапад тэмператур: і гарачыню, і прахалоду.

Калі кіравалася да выхаду, заўважыла прыпаркаваную непадалёку шыкоўную легкавушку, з якой выйшла вабная, добра апранутая жанчына. Вачам не веру, незнаёмка заходзіць у краму. Няўжо такая прыгажуня з нарошчанымі пазногцямі здольная корпацца ў зямлі?



— У нас даволі забяспечаная сям'я, маем за горадам добры катэдж, участак зямлі, які ў асноўным заняты кветкамі, альпійскімі горкамі, англійскім лужком. Але летась пасеялі яшчэ і зеляніну: пятрушку, кроп, каляндру. Да самай восені ўжывалі «вітаміны» са сваёй градкі. Сёлета вырашылі яшчэ і цыбулю пасадзіць, — падзялілася са мной планамі Тамара. — Бясспрэчна, гародніну прасцей купіць на рынку. Але для мяне важны сам працэс. Ды і праца на свежым паветры (вядома, у меру) ідзе толькі на карысць. Сярод нябедных людзей пайшла мода на здаровую ежу. А што можа быць лепш за тое, што вырашчана для сябе, з душой?

Давялося стаць сведкай і даволі смешнага выпадку. Адзін малады дзівак усё дапытваўся ў прадаўцоў і пакупнікоў, дзе можна купіць таматнае дрэва. Хтосьці смяяўся ў адказ (маўляў, селекцыянеры яшчэ выводзяць), а нехта круціў пальцам каля скроні.

Але хлопец імкнуўся даказаць, што яно існуе ў прыродзе — інтэрнэт не будзе махляваць.

— А ты паспрабуй не пасынкаваць каліва, вырасце калі не дрэва, то куст, — пажартавала адна з пакупніц.

Між іншым, калі верыць надпісу на ўпакоўцы, то варта набыць новы гатунак таматаў «Баяя» для балкона, з аднаго куста можна зняць за сезон да 700 пладоў. Чым не дрэва?

Прынамсі, я не маю дачы, таму купіла зярняты хатніх памідораў «Пінокія». Гатунак падыдзе таму, у каго няма не толькі кавалка зямлі, але нават і балкона.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой зарослая крынічка».
Якуб КОЛАС.

№ 2 (424)

## УРАДЖАЙНАЯ ГРАДКА

**Чаму ў дасведчаных агароднікаў і расце ўсё хутчэй, і паспявае, ды і сіл расходуюць яны менш? Сакрэт просты — назапашаны досвед адбіваецца! Пакуль ёсць час, можна скласці план пасадкі на агародзе, скарыстаўшы досвед прафесіяналаў і вопытных гаспадароў.**

Кожная гародніна сілкуецца глебавымі рэчывамі па-свойму. Бульба, напрыклад, забірае з глебы ў тры разы больш калію, чым капуста. Затое азоту капуста бярэ ўдвая больш, чым бурак. Ад пастаяннага «месца жыхарства» агароднінных культур глеба зношваецца, і, адпаведна, якасць ураджаю пагаршаецца. Калі вы на працягу многіх гадоў саджаеце бульбу, моркву, капусту на адным і тым жа месцы, то не здзіўляйцеся, што з кожным годам ураджай становіцца ўсё горшым і горшым. Таму пры пасадцы агароднінных культур трэба выконваць чарговасць, напрыклад:

❒ Капуста сярэдніх і позніх гатункаў лепш за ўсё ўдаецца пасля памідораў, бульбы, гароху, морквы і буракоў.

❒ Цыбуля і часнок добра растуць пасля агуркоў, памідораў, капусты, бульбы.

❒ Памідоры, перац, баклажаны саджайце пасля агуркоў, кабачкоў, гарбузоў, гароху, ранняй і квяцістай капусты.

❒ Моркву можна сеяць там, дзе летась былі раннія капуста або бульба, дапушчальна пасля памідораў і гароху.

Зараз самы час прадумаць, як павысіць аддачу свайго агарода, як можна выкарыстаць паўторна зямлю, якая вызваліцца з-пад радыскі або салаты.

Лепшыя спалучэнні гародніны для паўторных пасеваў:

❒ Ранняя радыска, пасля яе — салата або кроп, а потым яшчэ і радыска на восень.

❒ Салату, кроп або раннюю цыбулю можна паспець вырасціць і ўбраць там, дзе запланавана ў пачатку чэрвеня высадзіць расаду памідораў або позняй капусты.

❒ Пасля ранняй бульбы, убранай у пачатку жніўня, паспее вырасці да замаразкаў квяцістая капуста з расады.

❒ Зімовая рэдзька вырасце пасля салаты або кропу, нават пасля ранняй бульбы.

## СЕЛЬДЭРЭЙ — «У МОДЗЕ»

**Яшчэ гадоў 15 назад рэдкі агароднік вырошчваў хоць бы ліставы сельдэрэй. Гэта культура, без якой мы выдатна абыходзіліся. Зараз жа ў яе шмат прыхільнікаў.**



З кожным годам усё большай папулярнасцю карыстаецца не толькі ліставы сельдэрэй, які выкарыстоўваюць як прыправу, але і чаранковы, і каранёвы, з якога гатуюць шмат смачных і вельмі карысных страў.

Калі ліставы сельдэрэй яшчэ можна вырасціць, пасеяўшы насенне прама ў грунт, то атрымаць паўнавартасны чаранковы або каранёвы безрасадным спосабам немагчыма.

Тэхналогія вырошчвання расады аднолькавая для ўсіх відаў сельдэрэю. Сеяць яго трэба ў канцы лютага або пачатку сакавіка. Усходжасць насення сельдэрэю павышаецца з гадамі. Сеяць яго лепш у кантэйнеры, і даволі рэдка. Пасля пасеву кантэйнер трэба паставіць у цёплае месца. Усходы з'явяцца праз 3 тыдні. Усходзіць сельдэрэй павольна, парасткі тонкія. Паліваць трэба асцярожна, лепш апырскваць. Нельга пераліць вады. Ніякага адмысловага догляду расада сельдэрэю не патрабуе: паліў, праветрыванне, цеплыня.

Высаджваць расаду трэба пасля таго, як міне пагроза замаразкаў. Пажадана, каб да гэтага часу вышыня раслін была каля 5-7 см. Расліны сельдэрэю, якія высаджваюцца, настолькі маленькія, што іх лёгка не заўважыць падчас праполкі або проста «вымыць» пры паліве. Каб гэтага не здарылася, можна надзець на сельдэрэй кубачкі ад смятаны, але з выразаным дном. Або проста разрэзаць пластыкавую бутэльку на кольцы шырынёй 4-5 см, потым надзець гэтыя кольцы на расліны. Спачатку сельдэрэй расце павольна, а потым хутка набірае сілу.

Чаранковы сельдэрэй любіць добра ўгноеную і добра дрэнажаваную глебу. Самае неабходнае для яго — пастаянная вільготнасць глебы, але без затаплення. Таму падрыхтуйце для сельдэрэя добрую мульчу.

На градку сеянцы высаджваюць на адлегласці 20 см адзін ад другога. Глебу абавязкова мульчыруюць, лепш за ўсё саломай. Кожныя 10 дзён падкормліваюць расліны вадкім угнаеннем. Глеба пад мульчай павінна быць умерана вільготнай. Вельмі добра для падкормкі выкарыстаць настой крапівы.

Калі расліны чаранковага сельдэрэю дасягнуць вышыні 45 см, загарніце хвосцікі ў цёмную паперу, зверху надзеньце гумку або абвяжыце. Верхняя частка расліны (15 см) павінна быць вольная ад абвязкі. Праз 12-14 дзён атрымаеце адбеленыя хвосцікі. Можна абвязваць паперай. А потым проста ўзяць высокія кубачкі ад смятаны. Выразаць дно і надзець на кусцік, шырокай часткай кубка ў зямлю. Прыкапаць і акучыць кубачак. Хвосцікі атрымліваюцца чыстыя. Але і паперай таксама добра.

Выгадаваць каранёвы сельдэрэй няпроста, але рэальна. Пачынаць трэба з падбору насення. Пашукайце чэшскае або нямецкае насенне каранёвага сельдэрэю. З ім будзеце з добрым ураджаем, калі ўсё астатняе зробіце правільна. Перад пасадкай расады ў адкрыты грунт глебу трэба добра заправіць арганікай. Сельдэрэй — расліна, патрабавальная да наяўнасці ў глебе пажыўных элементаў. У яго таксама вялікая патрэба ў вадзе, асабліва ў перыяд развіцця караняплоду з жніўня да кастрычніка. Але кожны дзень паліваць сельдэрэй не трэба, гэта можа стымуляваць з'яўленне грыбковых захворванняў, напрыклад, плямістасці лісця.

Вельмі важна адкопваць грунт ад каранёў, калі разетка лісця будзе ўжо вялікая і пачне расці караняплод. Трэба злёгку падрэзаць бакавыя карані расліны, каб не фарміравалася «барада». Але ў добрых гатункаў не назіраецца бакавых каранёў.

## НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

**6 сакавіка — Дзень прападобнага Цімафея Веснавея.** Выходзілі на прызбу старыя, якія ўсю зіму на печы сядзелі, — пагрэць на вясновым сонейку свае костачкі.

Лічылася, што з гэтага дня неабходна кожны дзень бываць на свежым паветры.

**7 сакавіка — Дзень Маўрыкія.** У гэты дзень можна ўбачыць першых гракоў, шпакоў і жаўрукоў. Адзначаўся ён і першымі сонечнымі адлігамі. Калі пералётныя птушкі ляцяць чародамі — да дружнай вясны.

**8 сакавіка — Дзень Палікарпа.** З 8 па 15 сакавіка чакалі вяртання халадоў.

На Палікарпа час сарокам у лес вяртацца, а цецерукам выступаць з запеўкамі.

Калі ў гэты дзень ясна, то і Вялікдзень будзе такі ж; снег — да халоднага Вялікадня. Месяц рагаты і яркі — яшчэ будуць моцныя маразы.

**9 сакавіка — Янаў дзень** (дзень знаходжання галавы Іаана Прадцечы).

Птушка віе гняздо, а пералётная ляціць з выраю.

Калі выпадае снег — то і Пакутны тыдзень будзе халодны, а калі суха, то не чакай дажджу і ў Вялікдзень. Калі птушкі пачалі віць гнёзды на сонечным боку — чакай лета халоднага.

**10 сакавіка — Дзень Тарасія-кумошніка.**

З гэтага дня не прынята спаць днём, каб не напала кумоха — трасца.

**12 сакавіка — Дзень Пракопа-дарогаразбуральніка.** Час вясновай бездаражы. Дзеткі хадзілі ў лес і на першых праталінах адшуквалі леташнюю «марэну» — журавіны і брусніцы.

**13 сакавіка — Дзень прападобнага Васіля-капельніка.**

На Васіля Цёплага сонца ў кругах — да ўраджаю.

## НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ

Сакавік — не вясна, а прадвесне. У сакавіку мароз скрыпучы, але не пякучы. Прыйшоў марток — надзявай сямёра парток. У сакавіку воблакі плывуць хутка і высока — да добрага надвор'я. Калі ў сакавіку вада не цячэ — у красавіку трава не расце. Калі ў сакавіцця завеі снег кладзецца на палі няроўна, хваліста, грудамі, то добра ўродзіць гародніна і яравое збожжа. Частыя туманы ў сакавіку прадвяшчаюць дажджлівае лета. Сухі сакавік — урадлівасць, дажджлівы — неўраджай. Калі здарыўся ў сакавіку гром — прыкмета ўрадлівасці. Вада з сакавіцкага снегу гаючая: яна дапамагае ад рабаціння і загару.

**Общество с ограниченной ответственностью «Экофорум»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**
**по продаже недвижимого имущества,**
**расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Мозырская, 4:**

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена лота, без НДС, руб. | Задаток 10%, без НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | 1. Здание АБК общей площадью 264 кв.м, – оценочная стоимость 713 602 000 рублей.<br>2. Гараж общей площадью 65,9 кв.м – оценочная стоимость 102 582 000 рублей. | 816 184 000 | 81 618 400 |

Организатор торгов – ликвидатор ООО «Экофорум» ЧУП «Юриспрудент».

Продавец – ООО «Экофорум».

С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.00: г. Гомель, ул. Мозырская, 4.

Задаток перечисляется **до 15.03.2012 г.** (включительно) на р/с 3012332652001 в Управлении по Гомельской области ОАО «Франсабанк», БИК 153001266, УНН 400033677.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 5% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 7 рабочих дней после подписания протокола и возместить затраты на проведение торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления до 16.00 **15.03.2012 года** по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5, ком. 3.

Дата, время, место проведения открытого аукциона **26.03.2012 года** в 16.00, г. Гомель, ул. Молодости, 5, ком. 3.

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества обращаться по телефону: (8029) 698 07 48.**

Кірмаш

штотыднёвы рэкламны выпуск № 6 (717)

аддзел рэкламы 287 17 79

### ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Касілка конная, сумяшчальная з трактарам.

Тэл. 8 029 699 80 87.

❒ Дача ў в. Чарняты Мядзельскага раёна, возера 100 м.

Тэл.: 8 021 555 12 33, МТС 777 23 09.

❒ Аднапакаёвая кватэра ў пас. Гарадзішча, Мінскі р-н.

Тэл.: 8 029 303 81 26, 8 029 303 83 05, 8 029 255 73 58.

❒ Морква, ёсць на корм, або абмен на жывёлу (трусы, цяля, парсючок), птушку (гусі, індычкі, качкі), з/часткі да трактара, с/г агрэгаты.

Тэл. 8 033 318 10 16.

❒ Падшыпнік «180502» — 16 шт.

Тэл. 8 029 153 53 78.

❒ Хата ў в. Гілікі Валожынскага р-на, 24 соткі, студня, г/пабудовы.

Тэл.: 8 01772 514 98, 8 029 506 45 94.

❒ Дом у в. Занарач, 65 кв. м, летні блочны, 0,25 га, побач лес, возера.

Тэл. 8 01771 44 356.

❒ 3-пакаёвая кааператыўная кватэра з гаражом, агародам у г. Гарадок (30 км ад Віцебска, 2-гі паверх, 65 м²), танна, растэрміноўка, або абмен на жыллё ў Мінску, прыгарадзе, даплата.

Тэл. 8 029 290 07 10.

❒ Дача (садаводства), курортнае месца на возеры Лосвіда (20 км ад Віцебска).

Тэл. 8 029 290 07 10.

КУПЛЮ

❒ Вузлы і агрэгаты да трактара ці абмен.

Тэл. 8 033 318 10 16.

❒ Дом, дачу ці прыватны надзел за 30 км ад МКАД.

Тэл. 8 029 757 76 32.

ЗВЯЗДА

**КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАШа ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.**

Пашпарт, серыя_______ №_____________ Выдадзены _______________

Подпіс ___________________ Дата __________

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЙ ФОНД ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА извещает о проведении открытого аукциона по продаже объекта государственной собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества (далее – аукцион) 10 апреля 2012 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, зал аукционов.**

**Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, конт. тел. (017) 200 20 89.**

НА АУКЦИОН ВЫСТАВЛЯЕТСЯ:

| | |
|---|---|
| **Предмет аукциона** | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания |
| **Место нахождения недвижимого имущества** | г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 11 |
| **Начальная цена предмета аукциона, руб.** | 12 088 161 017 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 9 820 184 937 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 2 267 976 080 белорусских рублей) |
| **Размер задатка (рублей), срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета** | 2 400 000 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, **назначение платежа – задаток для участия в аукционе** |
| **Продавец недвижимого имущества** | Белорусский государственный университет, 220030, г. Минск, просп. Независимости, 4, конт. тел. (017) 209 50 94, 209 59 83 |
| **Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества** | Общая площадь – 0,9690 га, кадастровый номер – 500000000003003954, вид вещного права – право аренды земельного участка, срок аренды – 5 лет |
| **Характеристика недвижимого имущества** | Представляет собой незавершенный строительством «Магазин наглядных пособий и учебного оборудования»; начало строительства – 1997 г., остановка – 2001 г.; состоит из трех сблокированных между собой зданий общей площадью – 17740 кв.м, в том числе:<br>- двух 5-этажных складских корпусов с сеткой колон 6х6 и высотой 6 м, где расположены складские помещения общей площадью 4862 кв.м;<br>- одного 2-этажного, где расположены административно-бытовые помещения, 2 магазина площадью 312 кв.м и 38 кв.м, насосная, механическая мастерская, экспедиция и другие помещения;<br>степень готовности – 65% |
| **Условия использования недвижимого имущества** | Без условий |
| **Условия использования земельного участка** | В соответствии с регламентами генерального плана г. Минска – для дальнейшего использования объекта под размещение производственных объектов малого бизнеса, предприятий бытового обслуживания, сервисного обслуживания автомобилей, административных зданий, проектно-исследовательских организаций, кредитно-финансовых учреждений, предприятий связи, офисов, издательств, предприятий торговли, общественного питания, а также предприятий иных объектов, размещение которых не противоречит функциональному назначению территории и генеральному плану |
| **Условия по продаже недвижимого имущества** | Возместить РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» стоимость работ по изготовлению ведомости технических характеристик объекта в размере 23 874 050 рублей на р/с 3012016353515 в отделении № 535 г. Минск ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, ОКПО 37558116, код банка 153001739, адрес банка: 220033, г. Минск, просп. Партизанский, 6а |

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227 по рабочим дням с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 9 апреля 2012 года включительно.**

**К участию в аукционе допускаются:** граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительство за границей, и лица без гражданства), консолидированные участники (два и более субъекта малого предпринимательства – индивидуальные предприниматели и (или) микроорганизации), представившие Организатору аукциона в сроки, указанные в извещении на участие в аукционе следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе заявитель (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником (далее – претендент на покупку), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Победителю аукциона (претенденту на покупку) в день проведения аукциона выдается копия протокола.

По заявлению победителя аукциона (претендента на покупку) Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка. Указанное заявление подается победителем аукциона (претендентом на покупку) в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения Организатором аукциона протокола о результатах аукциона. Решение о предоставлении рассрочки внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка принимается Минским горисполкомом в течение 5 рабочих дней со дня получения заявления о предоставлении рассрочки.

Рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка предоставляется в порядке установленном решением Минского горисполкома от 30.04.2009 № 1015 «Об утверждении Инструкции о порядке внесения платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан внести плату (часть платы – в случае, предоставления рассрочки ее внесения) за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении земельного участка. Размер возмещаемых затрат доводится до сведения участников аукциона до начала его проведения.

После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, и представления Организатору аукциона, Продавцу и в Минский горисполком копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Минским горисполкомом – договор аренды земельного участка.

Оплата цены продажи недвижимого имущества осуществляется в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли- продажи в республиканский бюджет.

Осмотр объекта на местности участниками аукциона производится Продавцом.

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ**

**Аукционы состоятся 9 апреля 2012 года в 11.00, 11.30 по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12, конференц-зал. Организатором аукционов является РУП «Белтелеком» в лице Могилевского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12.**

НА АУКЦИОНЫ ВЫСТАВЛЯЮТСЯ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:

**1. Отдельные помещения на 4 этаже в капитальном строении (здание АТС 24), общей площадью 521,0 кв.м (33,8; 20,9; 15,5; 36,6; 15,4; 20,5; 15,5; 20,3; 35,2; 23,6; 12,1; 95,2; 176,4) по ул. Турова, 1 в г. Могилеве.** Срок договора аренды – на неопределенный срок, но не менее 3-х лет; коэффициент по пункту 9.2. Указа Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 года № 518 «О некоторых мерах аренды и безвозмездного пользования имуществом» 1,0. Помещения будут выставлены тринадцатью лотами:

Лот № 1: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 295 750 рублей, размер задатка – 29 575 рублей.

Лот № 2: Начальная цена продажи права заключения договора аренды 182 875 рублей, размер задатка 18 285 рублей.

Лот № 3: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 135 625 рублей, размер задатка – 13 560 рублей.

Лот № 4: Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 320 250 рублей, размер задатка составляет 32 025 рублей.

Лот № 5: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 134 750 рублей, размер задатка – 13 475 рублей.

Лот № 6: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 179 375 рублей, размер задатка – 17 938 рублей.

Лот № 7: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 135 625 рублей, размер задатка – 13 563 рубля.

Лот № 8: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 177 625 рублей, размер задатка – 17 763 рубля.

Лот № 9: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 308 000 рублей, размер задатка – 30 800 рублей.

Лот № 10: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 206 500 рублей, размер задатка – 20 650 рублей.

Лот № 11: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 105 875 рублей, размер задатка – 10 588 рублей.

Лот № 12: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 833 000 рублей, размер задатка – 83 300 рублей.

Лот № 13: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 1 543 500 рублей, размер задатка – 154 350 рублей.

**2. Отдельные помещения на 4 этаже в капитальном строении (здание АТС 23), общей площадью 614,3 кв.м (38,3; 5,0; 559,5; 4,2; 7,3;) по бульвару Юбилейному, д. 21 в г. Могилеве.** Срок договора аренды – на неопределенный срок, но не менее 3-х лет; коэффициент по пункту 9.2. Указа Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 года № 518 «О некоторых мерах аренды и безвозмездного пользования имуществом» 1,0. Помещения будут выставлены на аукцион одним лотом. Начальная цена продажи права заключения договора аренды 5 375 125 рублей, размер задатка – 537 510 рублей.

Документы на участие в аукционе принимаются **с 07.03.2012 года по 05.04.2012** в рабочее время (с 8.30 до 17.00) по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12, каб. 401. Документы, поданные **после 05.04.2012 года**, не рассматриваются.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, перечисляет задаток на с/с 3012200007522 в филиале № 700 Могилевского областного управления АСБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700838273, Могилевский филиал РУП «Белтелеком».

Извещения о проведении первых аукционов были опубликованы в газете «Звязда» за 11 мая 2011 года № 85, 11 июля 2011 № 108, 12.08.2011 № 152, 18.10.2011 № 198.

Контактные телефоны: (8 0222) 29 21 33, 29 22 13, факс 22 54 58.

■ Спадчына

# СУСТРЭЛІСЯ ВІТАЎТ, СКАРЫНА І БУДНЫ...

## Адкуль матывы валошак у адзенні святара?

**Экспазіцыя Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі папоўнілася чатырма новымі заламі па тэме «Рэлігія і культура ў Беларусі XIV — XVIII стагоддзяў».**

**— Мяркуем, што для неабыякавых да нашай спадчыны людзей гэта будзе вельмі цікавае падарожжа ў мінулае. Тут не навязваюцца нейкія погляды, падыходы, а можна на гістарычных фактах,**



Габелен. Сцэны палявання (па матывах паэмы М. Гусоўскага «Песня пра зубра»). С. Свістуновіч (нар. 1946). Мінск. 1980 г. Воўна. Ткацтва.

**экспанатах даведацца пра развіццё нашай культуры, якая, безумоўна, фарміравалася пад уплывам рэлігійных арганізацый, —** гаворыць **дырэктар музея Людміла КАРНІЛАВА** і запрашае карэспандэнта «Звязды» ўбачыць гэта на свае вочы.

Мой гід, **намеснік дырэктара музея Ігар ГАНЧАРУК**, расказвае, што ў музейных фондах сёння больш за 60 тысяч экспанатаў — жывапіс, старадрукі, творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, абразы. Прычым сярод іх — сапраўдныя жамчужыны нашай спадчыны, якія можна ўбачыць толькі тут, у адзіным у краіне музеі гісторыі рэлігіі.

— Чаму новая экспазіцыя пачынаецца з выяў гербаў, да якіх належалі славутыя роды нашай Бацькаўшчыны — Храптовічы, Хадкевічы, Агінскія, Алелькавічы?

— Яны былі мецэнатамі, засноўвалі друкарні, — расказвае Ігар Ганчарук. — Вось, напрыклад, Евангелле, якое надрукавана пры падтрымцы князя Рыгора Аляксандравіча Хадкевіча. Гэта першае друкаванае евангелле на нашых землях.

— Арыгінал?

— Гэта муляж. Але, пэўна, усе музейшчыкі ведаюць, што нават пры існаванні арыгіналаў кнігі павінны быць заменены на муляжы, бо папера можа разбурацца. Таму і ў гэтай экспазіцыі арыгіналы, якія яшчэ прысутнічаюць, з часам будуць заменены на муляжы.

Пакуль жа можна ўбачыць і арыгіналы. Напрыклад, спецыяльна надрукаваны ў Вільні (1684) для брыгіцкага кляштара ў Гродне брэвіярый для адпраўлення службаў. Прычым у кнізе захаваўся нотны рукапісны зборнік (які, пэўна, быў уклеены манашкамі) з меладычнымі формуламі грыгарыянскага харалу (спеў у адзін голас). У адрозненне ад службоўнікаў, дзе рэгламентаваўся шматгалосы касцельны спеў з выкарыстаннем музычных інструментаў, сярод якіх галоўная роля належала аргану.

Прадстаўлены ў экспазіцыі і «Рымскі імшал», які ў 1741 прадстаўнік славутага магнацкага роду Мікалай Фаўстын Радзівіл і яго жонка Барбара ахвяравалі дзятлаўскай парафіі (пра што сведчыць запіс на старонцы кнігі), іншыя старадрукі.

Экспазіцыя не проста знаёміць з нашымі славутасцямі (Барысаглебская царква ў Гродне, Мураванкаўская і Сынкавіцкая цэрквы абарончага тыпу, касцёл у Ішкалдзі — самы старажытны на беларускіх землях, які захаваўся да нашага часу), але і падае мінуўшчыну праз дзеячаў той эпохі. Князь Вітаўт, Францыск Скарына, Мікола Гусоўскі, Сымон Будны, Мікалай Радзівіл Чорны, Васіль Цяпінскі, Сімяон Полацкі, Марцін Пачобут-Адляніцкі... Прычым не толькі з партрэтамі, гістарычнымі звесткамі, але і з поглядамі на гэтых асоб, іх творы нашых сучаснікаў.

— Звярніце ўвагу, напрыклад, як арганічна глядзяцца ў экспазіцыі кракаўскае выданне 1523 года паэмы «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага



У музеі.

і габелен «Сцэны палявання» паводле гэтага выдатнага твора, — зазначае Ігар Ганчарук. — Дарэчы, габеленавая тэхніка была ўласцівая і старажытнаму беларускаму мастацтву, яе лепшыя ўзоры ў свой час упрыгожвалі сцены палацаў, камяніц, манастыроў.

Дарэчы, гэта той выпадак, калі варта скарыстацца «звяздоўскай» рубрыкай: «Ведай нашых!» Бо аўтар гэтага габелена — Сымон Свістуновіч, журналіст «Звязды».

А вось аўтар драўляных скульптур святых Казіміра і Станіслава (1630-я гады) па сёння застаецца невядомым. Хоць ідэя (чаму яны разам) зразумелая: святы Казімір быў абвешчаны патронам Вялікага Княства Літоўскага, а святы Станіслаў з'яўляўся патронам Каралеўства Польскага. Яны павінны былі сімвалізаваць дзве часткі тагачаснай агульнай дзяржавы.

Не ведаем мы і аўтараў барочных скульптур-пута (маленькіх хлопчыкаў з крыламі), якія сімвалізуюць чысціню і беззаганнасць дзяцінства і шырока выкарыстоўваліся ў розных відах сакральнага мастацтва. Альбо хто палічыў неабходным аздобіць адзенне



«Кнігі жыцій святых» Кіева-Пячэрская лаўра 1764 г.

святара XVIII стагоддзя фрагментамі слуцкіх паясоў з сімвалічным для Беларусі матывам валошак?

...Сёлета Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі плануе пабудаваць экспазіцыю пра рэлігію і культуру на беларускіх землях у XIX стагоддзі і да нашага часу. Прычым у дачыненні да сучаснасці будзе выкарыстана сістэма інфакіёска з аператыўнымі звесткамі аб адпаведных падзеях у гэтай сферы. Акрамя таго, разлічвае дырэктар музея Людміла Карнілава, у перспектыве наведнікі змогуць скарыстацца паслугамі аўдыёгіда.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА**



Арнат з устаўкай са слуцкага пояса.

■ «Брэнды» Айчыны

# БЕЛАРУСКІЯ ДЖЫНСЫ — ЭКСПАРТНАЯ «ФІШКА»

**Лён становіцца беларускім «брэндам» — такім жа, як бульба. Яго выява ўпрыгожвае дзяржаўны герб. Лён — традыцыйная нацыянальная сельскагаспадарчая культура. Да нашых дзён ад продкаў дайшлі сакрэты вырабу з ільну разнастайнай прыгожай прадукцыі, карыснага для здароўя адзення. Лён выкарыстоўваецца ў фармакалогіі і медыцыне. А льняны алей, як упэўніваюць дыетолагі, больш карысны, чым іншыя. Лён з Беларусі ўпэўнена скарае свет. Цікавы, дарэчы, факт: за ўсе гады дзейнасці аршанскага льнокамбіната — лідара льняной галіны краіны — тут выrabілі столькі тканіны, што ёю можна 87 разоў абкруціць зямны шар па экватары.**

Па ацэнках спецыялістаў, беларускі лён пры правільным падыходзе зможа літаральна азалаціць беларусаў.

У беларускай ільняной індустрыі добрая перспектыва. І не далёкіх гадоў, а блізкая. Першы этап тэхнічнага пераўзбраення быў праведзены за кошт субсідый з рэспубліканскага бюджэту ў суме 53 мільярды рублёў: у 2007-2009 гадах на аршанскім ільнокамбінаце ўстанавілі і запусцілі больш за 120 станкоў.

Пытанне развіцця прадпрыемстваў ільняной галіны, яе функцыянавання было разгледжана на пасяджэнні з удзелам Прэзідэнта краіны яшчэ вясной 2010-га. У выніку запланавалі ў 2010—2012 гадах правесці мадэрнізацыю камбіната з выхадам на тэхнічны ўзровень, які адпавядае лепшым сусветным вытворчасцям аналагічнага профілю. А цалкам на праектную магутнасць прадпрыемства выйдзе да 2015 года.

Нагадаю, што на гэтым буйнейшым прадпрыемстве па вытворчасці і рэалізацыі льняных тканін і іншых вырабаў з ільну працуюць 30 працэнтаў ад усіх занятых у прамысловасці Оршы — каля 6 тысяч чалавек. І ў асноўным жанчыны.

Як расказаў карэспандэнту «Звязды» **дырэктар прадпрыемства Уладзімір НЕСЦЯРЭНКА**, летась прадукцыя камбіната пастаўлялася амаль у трыццаць краін свету, сярод якіх ЗША, Канада, Францыя, Германія, Італія і гэтак далей. Ужо ў снежні мінулага года сярэдняя зарплата тут склала тры мільёны рублёў, а да канца гэтага плануецца павысіць сярэдні заробак да 500 долараў у эквіваленце. А было ж, калі зарплата тут значна адставала ад сярэдняй па Віцебскай вобласці. Чысты прыбытак прадпрыемства на час нашай размовы склаў 73 мільярды рублёў.

Камбінат мае шэсць фірменных крам у Беларусі, ёсць прадстаўніцтвы і за мяжой. Адкрылі нядаўна новыя — у Варшаве і Іванаве (Расія). Пэўныя прэферэнцыі гарантуе ўваходжанне камбіната ў склад свабоднай эканамічнай зоны «Віцебск». Дасягненню добрых эканамічных паказчыкаў паспрыяла і перадача гораду Палаца культуры, інтэрнатаў, аздараўленчага лагера і жыллёвага фонду.

Праўда, падчас нашай размовы на складзе знаходзіліся рэшткі гатовай прадукцыі — аж з 2007 года. Каб рэалізаваць назапашанае, камбінату неабходна правесці яго пераацэнку і распачаць больш актыўнае супрацоўніцтва з гандлем.

Сёння на Віцебшчыне засталіся ўсяго дзесяць ільнозаводаў — у два разы менш, чым было, і пакуль што яны не могуць поўнасцю забяспечыць аршанскі камбінат сыравінай. Ды і якасць гатовай прадукцыі, мякка кажучы, вымушае жадаць лепшага — бо ўсяго на некалькіх лініях можна якасна перапрацоўваць трасту ў ільняное валакно. У перыяд 2012—2013 гадоў заводы неабходна мадэрнізаваць, каб яны маглі вырабляць якаснае, кароткае і доўгае, ільновалакно.

Па-ранейшаму разглядаецца пытанне стварэння «льнянога» холдынгу — «Віцебскі лён», у склад якога ўвойдзе і Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, дзе займаюцца распрацоўкай мадэляў адзення, вучаць на тэхнолагаў. Ёсць ідэя стварыць пры льняным камбінаце ўласную буйную фабрыку па пашыве модных вырабаў, якія вельмі запатрабаваныя. Напрыклад, падчас знакамітага міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» многія госці купляюць на памяць сувеніры з ільну. Прадаецца і «фішка» — ільняныя джынсы — у якіх не бывае спякотна пры самых высокіх тэмпературах. А каштуюць такія штаны ў разы менш, чым «традыцыйныя» джынсы. Вырабляюць з ільну і абутак. Такім чынам, дзякуючы нашаму льну можна і апрануцца, і абуцца ў натуральныя рэчы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Орша — Віцебск*

**P.S.:** ***Сёння Аршанскі льнокамбінат з'яўляецца галоўным экспарцёрам прадукцыі перапрацоўкі льновалакна, але акрамя яго, ёсць і іншыя прадпрыемствы, якія гэта робяць. Яны набываюць ільносыравіну ў адпаведных заводаў па нізкіх унутраных цэнах. А затым экспартуюць сваю прадукцыю за мяжу — але ўжо па цэнах сусветных. І маюць у выніку высокую рэнтабельнасць (у адрозненне ад тых жа льнозаводаў). Таму, лічаць у Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, перапрацаваную сыравіну Аршанскаму льнокамбінату па-ранейшаму неабходна пастаўляць з заводаў па ўнутраных закупачных цэнах, а вось усім іншым беларускім прадпрыемствам — па сусветных цэнах (зніжаных амаль на чвэрць). Гэта дазволіць ільнозаводам, якія перапрацоўваюць сыравіну, падняцца з каленяў і выйсці хоць бы на невялікую рэнтабельнасць.***

***Што ж датычыцца стварэння «льнянога» холдынгу, то ідэю не падтрымаў канцэрн «Беллегпрам» (у склад якога ўваходзіць Аршанскі льнокамбінат). Спецыялісты палічылі, што немагчыма аб'ядноўваць у адну структуру камбінат і льнозаводы, якія працавалі са стратамі (прынамсі да мінулага года). Сёння сітуацыя пачала паляпшацца, таму ідэя стварэння холдынгу зноў становіцца актуальнай. У холдынг можна будзе аб'яднаць напачатку не ўсе заводы, а толькі тыя, якія працуюць найбольш эфектыўна... У любым выпадку, калі такі холдынг створыцца (у 2013 годзе), гэта дасць магчымасць размяркоўваць прыбытак у «льняной галіне» больш эфектыўна і справядліва: так, каб засталіся не ў крыўдзе не толькі вытворцы і прадаўцы гатовай прадукцыі, але і тыя, хто вырошчвае і перапрацоўвае беларускі лён.***

■ Былое і думкі

# ПА ЛАБІРЫНЦЕ НАДЗЕЙ

**У часы існавання Саюза стаўленне да творчай інтэлігенцыі было асаблівым.**
**— О, як некалі дружна жылі, — успомніла неяк ужо немаладая паэтка. — Ездзілі па ўсёй краіне, выступалі. А якія незабыўныя сустрэчы былі ў Грузіі, Узбекістане!.. Усюды нас віталі, сталы ламіліся ад пачастункаў!..**

Усё гэта сапраўды было, толькі вось пра тое, за чый кошт ездзілі тыя дэлегацыі, ніхто не казаў.

Аднойчы на Свіцязі давялося ўбачыць маладога паэта Д., які ішоў берагам возера з групай німфаў і юнакоў з шампанскім. Паэт жэстыкуляваў, а скрозь кроны дрэў на сонцы ззяла Свіцязь — вось яна, элінiстычная карціна бесклапотнага, ціхамірнага жыцця. Праз колькі гадоў пасля распаду Саюза я выпадкова ўбачыў Д. у сталіцы і не адразу пазнаў. На твары не ўзнёсласць, а штодзённасць і турботы.

Творцы не пакутавалі ад недахопу ўвагі дзяржавы, і калі паэт уваходзіў у творчы Саюз, то яму былі гарантаваны праца і зарплата, кніжкі таксама выдаваліся. А мастакам і ўвогуле прывольна жылося. Заказаў усім хапала, нават на лозунгах і ўрачыстых абяцаннях юнага піянера можна было мець добры заробак...

Памятаю, як у Польшчы і Германіі калегі па пэндзлі здзіўляліся, што савецкі мастак можа пракарміць сям'ю. Там адзін-два найбольш вядомыя творцы могуць зарабіць грошы на творах, а астатнім даводзіцца працаваць таксістамі, прадаўцамі...

Савецкаму мастаку заказы давала дзяржава, яна ж і плаціла. Самую высокую цану меў твор на гістарычна-рэвалюцыйную тэму ці ваенную з многафігурнай кампазіцыяй. Вось і стараліся максімальна выкарыстоўваць гэтыя сюжэты. Мазаікі, роспісы, вітражы... упрыгожвалі інтэр'еры і будынкі розных установаў, хоць архітэктуру тых будынкаў (гэта сёння ўжо відаць) не маглі выратаваць ніякія мазаікі. Міністэрства культуры БССР таксама рабіла заказы на карціны, і тысячы тых карцін сёння знаходзяцца ў запасніках нашых музеяў. Такія былі правілы гульні, але, як ні дзіўна, яны не задавальнялі найперш саміх творцаў: сацыялістычны рэалізм усім ужо надакучыў, хацелася творчай свабоды.

У савецкі час многія творцы пераацэньвалі свае магчымасці. Думалі, што кожны можа здзівіць свет, і ва ўсім абвінавачвалі ідэалогію. Тагачасны партыйны апарат, сапраўды, указваў, што маляваць і як, але разам з гэтым вырашаў бытавыя праблемы творцаў. У мастака не балела галава пра хлеб штодзённы, за майстэрню ён плаціў мізар, а пры жаданні заўсёды можна было, нават без вялікіх намаганняў, мець зарплату.

Калі распаўся Саюз, аказалася, што разам са знікненнем «накіравальнай сілы» не стала і заказаў. Вялікая армія мастакоў-афарміцеляў засталася без працы, бо не было патрэбы ў лозунгах, сацабавязацельствах, плакатах... І мастакам, якія працавалі ў сістэме Мастацкага фонду, ужо неабходна было спадзявацца толькі на сябе. Высветлілася, што мала напісаць карціну — яе яшчэ неабходна і прадаць. А дзе знайсці пакупніка, які мог бы заплаціць больш-менш значную цану? Для масавага спажыўца паўсюдна прапаноўваюцца недарагія копіі карцін у «залатых» рамках, якія задавальняюць непатрабавальны густ насельніцтва.

Я доўгі час працаваў у Мастацкім фондзе і ведаю, у якім цяжкім становішчы аказаліся мастакі пасля распаду Саюза. Філіял камбіната «Мастацтва» ў Баранавічах закрыўся, мастакі разбрыліся хто куды. Нехта, найбольш дзелавы ці проста ўвішны, заняўся вырабам рэкламных шыльдаў і шчытоў, але многія ўжо не ўпісваліся ў рыначную рэчаіснасць. Давялося мяняць прафесію і займацца чымсьці іншым, напрыклад, сталярнічаць — выраблць рамкі, вокны, лесвіцы для катэджаў. Ёсць некалькі чалавек, якія знайшлі «выхад» на Захад і прадаюць там свае творы па нізкай цане, хоць па нашых мерках кошт даволі высокі.

А вось калега, з якім давялося працаваць у мастацкай майстэрні, «асеў» у Баранавіцкім тэхналагічным каледжы, а яшчэ выкладае ў сярэдняй школе ды адвозіць карціны на продаж у Нясвіж, дзе праз краму аддзела культуры ўдаецца нешта і рэалізаваць. Найперш запатрабаваны тутэйшыя краявіды з палацам, касцёлам і паркам. Вось і даводзіцца прыстасоўвацца, бо за месца пад сонцам неабходна змагацца... Але ёсць і тыя, хто не вытрымаў і сышоў з дыстанцыі, спіўся.

Не дзіўна, што мастакі ўспамінаюць савецкі перыяд, як «райскае жыццё». Можна было бясконца пад чарку і шкварку разважаць пра мастацтва, захапляцца Далі і Пікаса, скардзіцца на ўціск і не думаць пра хлеб надзённы.

А ў наш час кожны павінен спадзявацца пераважна на сябе. Хоць падтрымка дзяржавы, як і мецэнацтва, спрыяюць раскрыццю таленту (калі, зразумела, ён у чалавека ёсць).

У мастацтве прамой дарогі няма. Найчасцей прыходзіцца блукаць па лабірынце ў надзеі знайсці выхад, свой шлях. На вялікі жаль, большасць так і застаецца ў лабірынце, які называецца жыццём.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ**

# НАРАЧАНСКІ ТРЫСНЁГ

**Дом з трыснягу... Дзіўна, пагадзіцеся. А між тым, справа гэта, можна сказаць, звычайная. Ну, калі не дом цалкам, дык частку яго можна пабудаваць з гэтага экалагічна чыстага матэрыялу.**



Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «ЭкаДомБуд», што размяшчаецца ў вёсцы Стахоўцы Мядзельскага раёна Мінскай вобласці, вырабляе з чароту цеплаізаляцыйныя пліты для жылых дамоў і іншых пабудоў, дэкаратыўныя цыноўкі, арміруючыя тынкавальныя сеткі, загатоўкі для стрэх. Дарэчы, калісьці падобныя матэрыялы шырока выкарыстоўваліся ў беларускіх вёсках, а ў сярэдзіне мінулага стагоддзя ў Савецкім Саюзе была наладжана вытворчасць так званага «чараціту». Старажытную страху, зробленую са снопікаў чароту, можна ўбачыць і цяпер у той самай вёсцы Стахоўцы.

Потым пра матэрыялы такія забыліся, але колькі гадоў таму фірма «ЭкаДомБуд» пры ўдзеле нямецкай дабрачыннай арганізацыі «Дамы замест Чарнобыля» адрадзіла вытворчасць трысняговых вырабаў. «Сёлета па гуманітарнай праграме мы збіраемся пачаць будаўніцтва фельчарска-акушэрскага пункта і дома для фельчара ў Лепельскім раёне на Віцебшчыне, — расказаў карэспандэнту «Звязды» **намеснік дырэктара прадпрыемства Сяргей ЖУК.** — Там з выкарыстаннем нашых трысняговых пліт ужо ўзведзена больш за два дзясяткі будынкаў. Некалькі аб'ектаў з выкарыстаннем трысняговых матэрыялаў пабудаваны ў Мінскай вобласці, напрыклад, у Вілейскім раёне — для дабрачыннай арганізацыі «Надзея—XXI стагоддзе». А матэрыял для стрэх прадаём усім ахвотным, ідуць невялікія пастаўкі ў Расійскую Федэрацыю. Арміраваную ж сетку і пліту пастаўляем у Германію».

Ураджай чароту супрацоўнікі «ЭкаДомБуда» збіраюць ўзімку, калі мацнее лёд. У прадпрыемства ёсць спе-



цыяльны камбайн італьянскай вытворчасці для ўборкі гэтага своеасаблівага ўраджаю. Але калі лёд недастаткова моцны, на жніво выходзяць людзі, узяўшы ў рукі звычайныя сярпы. За сезон тым ці іншым чынам нарыхтоўваюць дзесьці па дваццаць тысяч снапоў — гэта прыкладна дзвесце тон сыравіны. Прычым нарыхтоўваюць яе не проста, як Бог дасць, а па тэхналогіі, рэкамендаванай навукова-даследчай лабараторыяй возеразнаўства факультэта геаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. А як жа інакш? Уборка экалагічна чыстага матэрыялу павінна весціся толькі так, каб не пашкодзіць азёрам. Збіраюць жа чарот у асноўным на возеры Нарач, а таксама на азёрах Мястра і Баторына. Убіраюць толькі аднагадовыя парасткі, бо яны ўсё роўна, загінуўшы, падаюць на дно возера і забруджваюць яго. Таму нават лепш зжаць гэтыя расліны, каб возера было чысцейшым. Як той казаў, і прыгожа, і карысна.

Што ж, трыснёг — гэта ўтульна, цёпла, экалагічна. І традыцыйна для Беларусі. А, калі традыцыі адраджаюцца, значыць, гэта каму-небудзь трэба. Магчыма, камусьці з вас, шаноўныя чытачы. Дом, накрыты, упрыгожаны і ўцеплены чаротам, — гэта ж мара. Ці не так?

**Марына ХІДДЖАЗ.**

■ Купляйце беларускае!

# БЯСПЕЧНЫ ТРЫКАТАЖ

**Ужо ў красавіку ААТ «Світанак» пачне выраб і пастаўку ў гандлёвую сетку мадэляў для будучых матуль. Гэта будзе яшчэ адзін своеасаблівы эксклюзіў прадпрыемства.**

Нягледзячы на тое, што большасць асартыментнага шэрагу трыкатажнай бялізны і верхняга трыкатажу для дзяцей і дарослых выпускаюць і іншыя беларускія вытворцы, «Світанак» імкнецца займаць пакуль адносна свабодныя нішы. Так, на постсавецкай прасторы жодзінская фабрыка адзіная выпускае аксамітнае палатно і, адпаведна, вырабы з такога палатна. Стабільна працягваецца і выраб адзення для самых маленькіх.

— Калекцыя «Кука-Вака» для ясельнай групы — сур'ёзны брэнд, і мы будзем працягваць актыўна ім займацца, — кажа **начальнік упраўлення маркетынгу і продажу ААТ «Світанак» Ігар СЯЛІЦКІ.** — У нейкі момант тая ж Расія выпусціла з поля зроку асартымент камплектаў, паўзункоў, камбінезонаў і касцюмаў для тых, каму ад 0 да 3 гадоў. Мы ж працягвалі актыўную распрацоўку ясельнай калекцыі, і на сёння можам забяспечыць усіх малых краіны сваёй прадукцыяй. Больш за тое, мы актыўна пастаўляем вырабы калекцыі «Кука-Вака» ў Расію, а цяпер асвойваем і рынак Казахстана».




У мадэлях «Кука-Вакі» выкарыстоўваецца толькі высакаякасная пража. Наогул, усе вырабы для дзяцей праходзяць строгі якасны кантроль, перыядычныя выпрабаванні ў лабараторыі Цэнтра навуковых даследаванняў лёгкай прамысловасці, дадатковую праверку ў Мінскім абласным цэнтры гігіены і эпідэміялогіі на адпаведнасць санітарна-хімічным, таксікалагічным і фізіка-гігіенічным патрабаванням. Большая частка мадэляў для самых маленькіх вырабляецца толькі са стапрацэнтнага баваўнянага палатна, якое валодае гіграскапічнасцю, гігіенічнасцю і антыбактэрыяльнымі вартасцямі. У такім адзенні адсутнічае рызыка ўзнікнення алергічных рэакцый, раздражняльнага ўздзеяння. Палатно добра прапускае паветра, таму скура дзіцяці лёгка «дыхае». Акрамя таго, адсутнічае рызыка выдзялення шкодных хімічных рэчываў з адзення на скуру, паколькі падчас вытворчасці выкарыстоўваюцца толькі спецыяльныя фарбавальнікі.

У Беларусі «Світанак» рэалізуе сваю прадукцыю праз фірмовыя крамы і рознічную сетку. У Расію трыкатаж пастаўляецца праз уласныя гандлёвыя дамы, буйных дылераў. Невялікімі партыямі прадукцыя адпраўляецца на рынкі краін СНД, Балтыі, Германіі і Фінляндыі.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

# ЭЛЕКТРОННЫЯ ТАРГІ — УЖО РЭАЛЬНАСЦЬ

**Радавым і законапаслухмяным грамадзянам мала што вядома пра работу судовых выканаўцаў. А між тым штогод нагрузка на іх выканаўцаў павялічваецца. Служба судовых выканаўцаў ідзе ў нагу з часам. Пра нюансы работы, вынікі мінулага года і планы на гэты год «Звяздзе» расказаў старшы судовы выканаўца — кіраўнік аддзела выканання пастаноў гаспадарчага суда Віцебскай вобласці Аляксей БАРАДУЛІН.**

***— Летась было больш працы ў судовых выканаўцаў гаспадарчага суда Віцебскай вобласці?***

— Так, захоўвалася тэндэнцыя да павелічэння колькасці выканаўчых дакументаў, прад'яўленых да прымусовага выканання. Заведзены 9194 выканаўчыя вытворчасці. Гэта на 4 працэнты больш, чым ў 2010 годзе. У якасці прычын гэтага неабходна адзначыць наступныя.

Значна павялічылася колькасць заведзеных выканаўчых вытворчасцяў аб спагнанні лізінгавых плацяжоў за сельскагаспадарчую тэхніку. Гэта звязана з колькасцю разгледжаных летась у гаспадарчым судзе загадных вытворчасцяў і неплацяжамі за набытую ў лізінг сельскагаспадарчую тэхніку. Так, на карысць ААТ «Віцебскі аблаграсэрвіс», ААТ «Заходне-Дзвінскі міжрайаграТэхсэрвіс» і РА «Белаграсэрвіс» распачата 1016 вытворчасцяў, што на 72 працэнты больш, чым у пазамінулым годзе.

Высокай застаецца колькасць заведзеных выканаўчых вытворчасцяў на карысць банкаў, сярод якіх найбольшыя паказчыкі ў ААТ «Белаграпрамбанк». Асноўную катэгорыю праблемных даўжнікоў гэтага банка складаюць сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Спаганяецца запазычанасць па крэдытах, выдадзеных пад гарантыі выканаўчых камітэтаў. Значная колькасць выканаўчых вытворчасцяў заводзіцца на карысць ААТ «БПС-Ашчадбанк» у дачыненні да даўжнікоў — буйных і сярэдніх прамысловых прадпрыемстваў.

Высокай застаецца колькасць заведзеных выканаўчых вытворчасцяў на карысць РУП «Віцебскэнерга». Асноўныя катэгорыі даўжнікоў складаюць сельскагаспадарчыя арганізацыі і прадпрыемствы, падведамныя Міністэрству прамысловасці Рэспублікі Беларусь (напрыклад, ААТ «Класіка індустрыі моды»). Да выканання прад'яўляюцца як новыя запазычанасці, так і тыя, якія ўзніклі некалькі гадоў таму, адтэрмінаваныя ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

Неабходна сказаць пра адсутнасць выканаўчых вытворчасцяў аб спагнанні запазычанасці з сельскагаспадарчых арганізацый на карысць Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Гэта стала вынікам выканання ўмоў прадастаўленых растэрмінова к у адпаведнасці з Указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб некаторых пытаннях сельскагаспадарчых арганізацый» № 92 ад 01.03.2010 года, № 34 ад 24.01.2011 года.

***— Напэўна, сёлета працы прыбавіцца?***

— Гаспадарчым судом у лістападзе мінулага года праведзена сумесная нарада па пытаннях спагнання запазычанасці з удзелам прадстаўнікоў Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь і асноўных спагнаннікаў, якія прад'яўляюць да выканання найбольшую колькасць выканаўчых дакументаў (РУП «Віцебскэнерга», ААТ «Белаграпрамбанк», ААТ «Віцебскі аблаграсэрвіс», Віцебскае абласное ўпраўленне Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва і іншыя). Паводле інфармацыі, прадстаўленай спагнаннікамі, сёлета чакаецца рост прад'яўлення выканаўчых дакументаў у гаспадарчы суд. І, як вынік, павелічэнне колькасці заведзеных выканаўчых вытворчасцяў. Варта адзначыць, што па заканчэнні студзеня, на жаль, гэты прагноз спраўджваецца.

***— Аб практыцы так званых прымірэнчых судоў газета ўжо расказвала. Наколькі эфектыўна яны дзейнічаюць?***

— Варта адзначыць, што колькасць выканаўчых вытворчасцяў, распачатых летась, магла быць значна большай, калі б не эфектыўнасць такога захада, як прымірэнчая працэдура. У выніку, у сувязі з невыкананнем пагадненняў аб прымірэнні, да прымусовага выканання было прад'яўлена толькі 245 выканаўчых дакументаў з 1797 завершаных прымірэнчых працэдур, што складае каля 14 працэнтаў.

У мінулым годзе гаспадарчым судом Віцебскай вобласці выкананы 9502 выканаўчыя вытворчасці, што на 16 працэнтаў больш, чым у 2010 годзе.

З гэтай колькасці вытворчасцяў амаль 66 працэнтаў выкананы рэальна, гэта значыць, поўным спагнаннем запазычанасці. І гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў у сістэме гаспадарчых судоў краіны.



***— А чым можна растлумачыць леташні рост выканання?***

— Гэта абумоўлена наступнымі прычынамі. Па-першае, павелічэннем эфектыўнасці і аптымізацыяй працы судовых выканаўцаў — за кошт прыцягнутых супрацоўнікаў па дагаворы падраду, якія выконваюць працу тэхнічнага характару. Як вынік, павялічыўся працоўны час судовага выканаўцы для непасрэднага здзяйснення выканаўчых дзеянняў. У той час як функцыі па выкананні тэхнічнай працы ўскладзены на прыцягнутых супрацоўнікаў.

Нягледзячы на тэмпы росту колькасці заведзеных выканаўчых вытворчасцяў, за кошт павелічэння інтэнсіўнасці працы судовых выканаўцаў упершыню за некалькі гадоў у гаспадарчым судзе Віцебскай вобласці ўдалося дабіцца змяншэння рэшткаў выканаўчых вытворчасцяў.

Яшчэ адна прычына — пастаяннае бягучае перспектыўнае планаванне работы і аналіз яе вынікаў. Іншымі словамі, мы ўвесь час трымалі руку на пульсе, адсочваючы тэндэнцыі ў змене асноўных паказчыкаў выканання.

Адбілася і прыняцце ў сакавіку мінулага года новай рэдакцыі пастановы Пленума Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь аб зацвярджэнні Інструкцыі па выканаўчай вытворчасці ў гаспадарчых судах Рэспублікі Беларусь, якая змяніла чарговасць і дазволіла ў пераважным парадку завяршаць працу па выканаўчых вытворчасцях аб спагнанні запазычанасці на суму да 100 базавых велічынь. Па названай прычыне павялічылася як агульная колькасць выкананых вытворчасцяў, так і колькасць рэальна выкананых. Для параўнання, за першы квартал мінулага года колькасць рэальна выкананых вытворчасцяў не перавышала 50 працэнтаў ад агульнай колькасці выкананых, а да канца года гэты паказчык вырас да 66 працэнтаў. Варта адзначыць, што колькасцю рэальна выкананых вытворчасцяў вымяраецца эфектыўнасць працы ўсёй службы судовых выканаўцаў.

Сярод іншых прычын можна назваць і павелічэнне колькасці дзейсных таргоў у выканаўчай вытворчасці. Летась праведзена 30 дзейсных таргоў, што з'яўляецца самым высокім паказчыкам у сістэме гаспадарчых судоў. З таргоў рэалізавана маёмасць даўжнікоў на суму больш за 8 мільярдаў рублёў. У правядзенні пяці дзейсных таргоў з вялікай колькасцю ўдзельнікаў ужывалася відэаздымка. Такая праца судовых выканаўцаў будзе працягнута і ў 2012 годзе.

***— А ці праўда, што цяпер ёсць магчымасць у бізнэсменаў купіць маёмасць на таргах, не выходзячы з офіса, дома?***

— Так, у 2012 годзе акцэнт у прымусовай вытворчасці плануецца зрабіць на новыя метады працы — электронныя таргі. У канцы мінулага года ў мэтах забеспячэння адкрытасці і даступнасці працэдуры рэалізацыі маёмасці судовымі выканаўцамі на інтэрнэт-партале гаспадарчых судоў Рэспублікі Беларусь пачаў функцыянаваць новы сэрвіс — «Электронныя таргі». Цяпер набыць арыштаваную маёмасць, выстаўленую на таргі судовымі выканаўцамі, можна, не выходзячы з офіса, дома. Удзел у таргах ажыццяўляецца дыстанцыйна.

Мы не сумняваемся, што выкарыстанне такога механізму дасць магчымасць павысіць эфектыўнасць рэалізацыі маёмасці даўжніка. У сувязі з гэтым гаспадарчым судом Віцебскай вобласці ўжо ў студзені прызначана пяць электронных таргоў. І плануецца праводзіць значную частку электронных таргоў у бягучым годзе.

***— Напэўна, найбольш складана спагнаць доўг з сельскагаспадарчых арганізацый, якія ў большасці сваёй, на жаль, пакуль што не могуць пахваліцца добрай рэнтабельнасцю і гатоўнасцю своечасова вяртаць запазычанасць? А што зроблена ў гэтым кірунку?***

— Летась праведзена вялікая цэнтралізаваная работа, накіраваная на спагнанне дэбіторскай запазычанасці з сельскагаспадарчых арганізацый. Гэта дазволіла спаганяць грошы даўжнікоў з дадатковых крыніц, у тым ліку ў іншых абласцях Беларусі. Напрыклад, такіх, як РУП «Крыніца», РУП «Белсолад», РУП «Белдзяржстрах». Сёлета гэтая работа актыўна працягваецца.

***— Наколькі эфектыўна судовыя выканаўцы супрацоўнічаюць з судамі агульнай юрысдыкцыі?***

— На павелічэнне колькасці выкананых вытворчасцяў значна паўплывала праца па ўзаемадзеянні з судамі агульнай юрысдыкцыі і ўпраўленнем юстыцыі Віцебскага аблвыканкама. Так, у рамках узаемадзеяння ў агульныя суды летась накіравана 1261 хадайніцтва аб здзяйсненні асобных выканаўчых дзеянняў, такіх як арышт маёмасці, канфіскацыя наяўных грашовых сродкаў, атрыманне пісьмовай інфармацыі ў даўжніка. Выканана даручэнняў па 845 хадайніцтвах, спагнана 114 мільёнаў рублёў.

***— А колькі ўсяго летась спагналі грошай? Ці перайшлі на бягучы год праблемныя пытанні?***

— Было спагнана амаль 17,8 мільярда рублёў, што на 4,76 мільярда рублёў больш, чым пазалетась.

Адным з праблемных пытанняў з'яўляюцца рэшткі выканаўчых вытворчасцяў мінулых гадоў. У цяперашні час актыўна праводзіцца работа па завяршэнні выканаўчых вытворчасцяў, заведзеных у 2009—2011 гадах.

Гаспадарчым судом Віцебскай вобласці пастаянна аналізуюцца і абагульняюцца праблемы ў правапрымяненні. Летась мы неаднаразова накіроўвалі прапановы па ўдасканаленні заканадаўства, якія ўключаны ў план працы Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь па падрыхтоўцы змяненняў і дапаўненняў у законапраекты на 2012 год. У студзені ўжо накіраваны прапановы па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у пастанову Пленуму Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь аб зацвярджэнні Інструкцыі па выканаўчай вытворчасці ў гаспадарчых судах Рэспублікі Беларусь. Адзначаныя змены актыўна абмяркоўваліся на праведзеным 3 лютага 2012 года пасяджэнні Прэзідыума Вышэйшага Гаспадарчага Суда.

Мы бачым перспектывы ўдасканалення заканадаўства і праблемы правапрымянення, прымаем самы актыўны ўдзел сумесна з Вышэйшым Гаспадарчым Судом Рэспублікі Беларусь у іх вырашэнні.

**Гутарыў Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Галівудскія ўсмешкі ў Раманавічах

У аграгарадку Раманавічы Магілёўскага раёна адкрыўся новы стаматалагічны кабінет. Такім чынам у агракамбінаце «Прыдняпроўскі» паклапаціліся пра сваіх работнікаў і ўсіх мясцовых жыхароў. Прадпрыемства закупіла амерыканскае стаматалагічнае абсталяванне і арандавала памяшканне побач з ФАПам і бібліятэкай. З абласнога цэнтра прыязджае некалькі разоў на тыдзень доктар. Раней, наадварот, з Раманавіч даводзілася ездзіць у Магілёў, каб палячыць зубы. Цяпер кваліфікаваную стаматалагічную дапамогу можна атрымаць на месцы, і людзі гэтым задаволеныя. Тым больш, мяркуецца, што кошт паслуг будзе ніжэйшым за гарадскі, а супрацоўнікі агракамбіната атрымаюць зніжку. Паводле папярэдніх падлікаў, пламбаванне будзе каштаваць 50-70 тысяч рублёў. У кіраўніцтва «Прыдняпроўскага» ёсць таксама ідэя адкрыць у аграгарадку тэрапеўтычны кабінет.

**Ілона ІВАНОВА**.


## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ за 2011 год

## ОАО «ПИВЗАВОД ОЛИВАРИЯ»

*220002, г. Минск, ул. Киселева, 30*

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2012 г.

(в млн руб.)

| АКТИВ | Код стр. | На начало периода | На конец периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| I. Внеоборотные активы | 190 | 76 002 | 163 806 |
| II. Оборотные активы | 290 | 65 122 | 127 839 |
| БАЛАНС | 390 | 141 124 | 291 645 |

| ПАССИВ | Код стр. | На начало периода | На конец периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| III. Капитал и резервы | 490 | 111 912 | 171 322 |
| IV. Обязательства | 590 | 29 212 | 70 242 |
| БАЛАНС | 600 | 141 124 | 291 645 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 января 2012 г.

(в млн руб.)

| Наименование показателя | Код стр. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 269 230 | 181 077 |
| Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 111 992 | 52 084 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) | 020 | 257 238 | 128 993 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 153 979 | 71 178 |
| Расходы на реализацию | 050 | 17 084 | 37 196 |
| **Прибыль (убыток) от реализации** | **070** | **19 453** | **20 169** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 67 028 | 29 297 |
| Налоги, включаемые в операционные доходы | 081 | 176 | 77 |
| Операционные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей) | 090 | 66 852 | 29 220 |
| Операционные расходы | 100 | 63 035 | 29 158 |
| **Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов** | **120** | **3 817** | **62** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 10 794 | 515 |
| Налоги, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 327 | 153 |
| Внереализационные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей) | 140 | 10 467 | 362 |
| Внереализационные расходы | 150 | 58 042 | 1 869 |
| **Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов** | **160** | **-47 575** | **-1 507** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД** | **200** | **-24 305** | **19 174** |
| Налоги и сборы, производимые из прибыли | 250 | | 5 087 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 260 | 378 | 867 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) К РАСПРЕДЕЛЕНИЮ** | **300** | **-24 683** | **13 220** |

1. Количество акционеров – всего 235, в том числе: юридических лиц – 2, физических лиц – 233.

2. Информация о дивидендах и акциях:

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 1500 | 1000 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 12258 | 8171 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тысяч рублей | 1049 | 686 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 122371 | 122371 |

3. Информация о задолженности:

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Просроченная дебиторская задолженность | миллионов рублей | | 1049 |
| Просроченная кредиторская задолженность | миллионов рублей | - | - |

4. Среднесписочная численность работающих (человек) – 551.

**Руководитель** **Чеченев М.Н.**

**Главный бухгалтер** **Дубовик Л.В.** УНП 100128525



## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 16 марта 2012 года**

**проводит 17-й, 2-й и 3-й повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности на 4-м открытом аукционе**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км/ Наработка в м/ч (износ в %) | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 6 | Автошасси КамАЗ-4310 ш. 014872, дв. 837711 | в/ч 04152, г. Молодечно | 1985 | 14 794 км 18,5 м/ч | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 11 | Автошасси УРАЛ-375Е из-под ТМС-65, ш. 447036, дв. 622293, 4 кат. | в/ч 42747, г. Старые Дороги | 1986 | 8 123 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 12 | Автотопливомаслозаправщик АТМЗ-5-4320-1012, ш. 059746, дв. 940128, с/о 2677, 2 кат. | г. Сморгонь, в/ч 2044 | 1986 | 17 438 | 312 000 000 | 31 200 000 |
| 13 | Автотопливомаслозаправщик АТМЗ-5-4320-1012, ш. 079215, дв. 109871, с/о 3414, 2 кат. | г. Гомель, в/ч 1242 | 1987 | 74 519,5 | 200 000 000 | 20 000 000 |
| 14 | Автотопливомаслозаправщик АТМЗ-5-4320-1012, ш. 027132, дв. 628913, с/о 1367, 2 кат. | г. Гомель, в/ч 1242 | 1984 | 78 218 | 194 000 000 | 19 400 000 |
| 15 | Топливозаправщик аэродромный ТЗА-7,5-5334 на базе МАЗ-5334, ш. 127360, дв. 222029, с/о А 9041502, 2 кат. | г. Поставы, в/ч 1257 | 1990 | 132 333 | 64 000 000 | 6 400 000 |
| 18 | Грузовой КамАЗ-43105, ш. 0017147, дв. 588956, 4 кат. | г. Ружаны, в/ч 39212 | 1988 | 197 427 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 165 | АТМЗ-5,5-4310 (автотопливомаслозаправ.) с/о 890234 на КамАЗ-4310, ш. 0056945, дв. 0386657, 4 кат. | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 1989 | 12 301 км, 1 664 м/ч | 115 000 000 | 11 500 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, каб. № 637 **16 марта 2012 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы **до 17.00 13 марта 2012 года.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **16 марта 2012 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 09 98, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

**Извещение о проведении аукциона № 17 от 01.11.11 опубликовано в газете «Звязда» № 187 от 30.09.2011, аукциона № 2 от 08.02.12 опубликовано в газете «Звязда» № 3 от 06.01.12 и аукциона № 3 от 29 февраля 2012 года опубликовано в газете «Звязда» № 18 от 28.01.12.**



## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**УП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 16 марта 2012 года**

**проводит 2-й повторный открытый аукцион от 28 января 2011 года по продаже имущества республиканской собственности на 4-м открытом аукционе**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км/ Наработка в м/ч (износ) | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 4/11 | Самолёт Ан-24Б № 99902203, дв. Аи-24 с. 2 № Н4912105, дв. Аи-24 с. 2 № Н4012035, дв. ТГ-16 № АТ945005, 5 402 посадки, 3 КВР-1994 г. | г.п. Мачулищи, в/ч 06752 | 1969 | 5 118 | 1 536 000 000 | 153 600 000 |
| 6/11 | Вертолёт Ми-26 № 34001212131, дв. Д-136 № 2251364001063, дв. Д-136 № 2251364001064, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 722А8В017 | г.п. Мачулищи, в/ч 06752 | 1987 | 594 | 11 357 000 000 | 1 135 700 000 |
| 7/11 | Вертолёт Ми-26 № 34001212104, дв. Д-136 № 2251364001067, дв. Д-136 № 2251364001068, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 622А8В006 | г.п. Мачулищи, в/ч 06752 | 1986 | 593 | 10 483 000 000 | 1 048 300 000 |
| 8/11 | Вертолёт Ми-26 № 34001212018, КАУ-140 № 82110014030, КАУ-140 № 821100140032, КАУ-140 № 821110140041, КАУ-140-01 № 821033010004, дв. ТА-8В № 042А8В058, 1 КВР-1990 г. | г.п. Мачулищи, в/ч 06752 | 1983 | 1 774 | 6 115 000 000 | 611 500 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, каб. № 637 **16 марта 2012 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы **до 17.00 13 марта 2012 года.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **16 марта 2012 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 09 98, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**


■ Да ведама

## У Мюнхен — на дадатковым

**З 29 мая па 29 верасня па маршруце Мінск — Мюнхен будуць выконвацца дадатковыя рэйсы адпраўленнем з Мінска ад АВ «Цэнтральны».**

Як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», адыходзіць аўтобус будзе па аўторках у 12.00. Адпаведна, з Мюнхена з 31 мая па 29 верасня дадатковы рэйс будзе выконвацца па чацвяргах у 13.00. Для выканання гэтых рэйсаў будуць задзейнічаны аўтобусы маркі «МАЗ-251» умяшчальнасцю на 40 месцаў.

На прадпрыемстве нагадалі, што рэгулярныя рэйсы па маршруце Мінск — Мюнхен пастаянна выконваюцца адпраўленнем з Мінска па серадах, пятніцах, нядзелях. З Мюнхена, адпаведна, яны выконваюцца па пятніцах, нядзелях і аўторках.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 13 апреля 2012 года проводит 6-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км/ Наработка в м/ч, расход ресурса в % | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 52 | Седельный тягач КрАЗ-258Б1, ш. 489435, дв. 965138, 4 кат. | г. Бобруйск, в/ч 20392 | 1984 | 168 887 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 53 | Седельный тягач КамАЗ-5410, ш. 154093, дв. 979190, 3 кат. | г. Новогрудок, в/ч 14103 | 1986 | 144 238 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 54 | Грузовой КамАЗ-4310, ш. 017184, дв. 853606, 3 кат. | Минский р-н, п. Дачный, в/ч 96754 | 1986 | 168 649 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 55 | Грузовой Урал-4320-0010, ш. 064862, дв. 987607, 3 кат. | г. Новогрудок, в/ч 14103 | 1986 | 136 344 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 56 | Электростанция ЭД2х30-Т/400-1РАМ1 № БИ3658МВПО на КАМАЗ-4310, ш. 0006778, дв. 0517484 с кузовом-фургоном К1-4320Д № 1190, 4 кат. | г. Береза, в/ч 23324 | 1989 | 777,5 м/ч 9 156 км | 150 000 000 | 15 000 000 |
| 57 | Электростанция ЭД2х30-Т/400-1РАМ1 № БИ3658МВПР на КАМАЗ-4310, ш. 0032890, дв. 0811964 с кузовом-фургоном К1-4320Д № 1189, 4 кат. | г. Береза, в/ч 23324 | 1989 | 1 032 м/ч 9 617 км | 150 000 000 | 15 000 000 |
| 58 | Аэродромная железобетонная плита ПАГ-14, 3 кат. Партия 34 штуки | г. Межица, в/ч 06405 | 1978 | 50 | 27 200 000 | 2 720 000 |
| 59 | Аэродромная железобетонная плита ПАГ-14, 4 кат. Партия 3 штуки | г. Межица, в/ч 06405 | 1978 | 70 | 1 800 000 | 180 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, каб. № 637 **13 апреля 2012 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы **до 17.00 10 апреля 2012 года.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **13 апреля 2012 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 09 98, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**



## БОГУШЕВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**Березинского района Минской области (далее Продавец)**
**Проводит открытый аукцион по продаже 1 (одного) земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Тополь:**

| № | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка | Наличие инженерных сетей | Начальная цена, (бел. рублей) | Задаток (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|
| № 1 | Березинский район, д. Тополь, 620480808601000023 | 0,1320 | электроснабжение | 1931690 | 193170 |

*** Примечание:** *земельный участок имеет ограничения в использовании земель в связи с нахождением в водоохранной зоне реки Березина.*

Задаток перечисляется на р/с № 3604030201878 в ЦБУ № 602 ф-ла № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Борисова, код 810, УНП 600036587, ОКПО 04431855.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с документацией и земельным участком.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится 12 апреля 2012 года в 10.00 по адресу: Березинский район, аг. Богушевичи, Богушевичский сельский Совет (зал заседаний).

Заявление на участие и необходимые документы принимаются ежедневно (кроме воскресенья) до 17.00 (в субботу до 13.00) по адресу: аг. Богушевичи Березинского района Минской области, Богушевичский сельский Совет.

Прием заявлений заканчивается не позднее чем за три рабочих дня до начала проведения аукциона.

Контактные телефоны: (8 01715) 48 3 12, (8 01715) 48 3 46.





